Свята ў Саках ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Гісторыя ў Суражы ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2689) Год LII | Беласток, 25 лістапада 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Пачынаючы з дзяцінства ў бежанстве, сярод дзевяці малечаў, а канчаючы тут, хоць у вельмі мілым месцы, дзе такая добрая кампанія сярод сваіх людзей і пры адметным доглядзе апекуноў пад вокам Мікалая Галёнкі, ды — не сярод радні. І, галоўнае, што б чалавек не перажыў, хай не перажывае, прымае ўсё што лёс нясе...

Бабе Любе сто гадоў!

Міра ЛУКША

фота Міры ЛУКШЫ

Мікола Карпюк, Люба Карпюк, Вольга Бароўская (знізу), Ніна Панасюк і Павел Пятроўскі (на другім плане)

Па дарозе з Беластока ў Белавежу праз Бельск-Падляшскі ў аўтобусе, які ехаў паўнюткі і з якога выходзілі ды сядалі новыя пасажыры я прыкмеціла асоб, якія ехалі на адно мерапрыемства, святочнае. З Беластока, з Бельска і з Галадоў. Селі яны спераду машыны, наўючаныя вялікімі пакетамі, букетамі кветак, а адзін з іх беражліва вёз нешта высокае, як аказалася, шматпавярховае, і то аж з самое Гдыні. Гэта Мікола Карпюк, афіцэр выратавальнага атрада вадалазаў, народжаны ў Шчытах, вёз сваёй матулі Любе Карпюк адмысловы бела-ружовы торт. У Беластоку сеў яе малодшы брат Павел Пятроўскі, у Бельску — сястра Вольга Бароўская, а ў Галадах — сястра Ніна Панасюк. Пра тыя Галады будзе ўспамінаць на кожным кроку старажылка, адна са старэйшых жыхароў пансіяната для прастарэлых „Ракітнік" у Белавежы, па-святочнаму апранутая, уквечаная, з гладкім ружовым тварам.

— Заўсёды была наша Люба румяная, — кажа праз слёзы сястра Оля, бо хоць дзень нараджэння гэта адно з найбольш прыемных свят за ўсё жыццё, ды ж якое тое жыццё было! Пачынаючы з дзяцінства ў бежанстве, сярод дзевяці малечаў, а канчаючы тут, хоць у вельмі мілым месцы, дзе такая добрая кампанія сярод сваіх людзей і пры адметным доглядзе апекуноў пад вокам Мікалая Галёнкі, ды — не сярод радні. І, галоўнае, што б чалавек не перажыў, хай не перажывае, прымае ўсё што лёс нясе. Дзве сястры, тры браты памерлі ўжо ў Любы. А Галады — тое месца-калыска ўсяе сям'і, па якой сумуюць, а найбольш Люба, якую турбуе думка: „Паедзем у Галады", а не тое, што ўвесь дом „Ракітнік" святкуе яе стагоддзе, што панаехала і сваякоў, і ўлад з гміны і павета, што прывезлі падарункі, кветкі, а нават паперу з віншаваннямі ад самога прэм'ер-міністра Рэчы Паспалітай. І ў царкву ёй хочацца, а пасля абавязкова — у Галады! І каб цяплей было. Абулі яе ў цёплыя лямцовыя каляровыя тапачкі, прыгожа апранулі ў ядвабныя хустачку ды кофту, у цёпленькі мяккі швэдрык, ды холад даймае. Хоць у „Ракітніку" цёпла як у вушку.

— Ой, добра нам тут жывецца, — кажа суседка Любы Карпюк па пакоі. — Дагледжаныя мы, усё нам пададуць. Ды Люба часам ноччу прачнецца і ўсё шукае, каб цяплей што надзець. Холад яе так даймае! Гэта, мабыць, яшчэ ад вайны, ці з бежанства яшчэ сібірскага. Намерзлася за ўсё жыццё... От, сто лет... Што тыя сто лет. Нядаўна тут у нас не дажыла тыдзень да ста годоў адна наша пенсіянерка, а ўжо рыхтаваліся... Невядома, каму што суджана. Адзін у нягодах дажывае глыбокай старасці, іншаму не хапае толькі галубінага малака...

— Якое яна жыццё пражыла! І нарадзілася крыху калекай. І выйшла замуж за нядобрага чалавека. Выгадавала дзяцей, павучыла, як ужо муж памёр... А нявесткі як нявесткі... Унук прывёз яе да мяне, — уздыхае сястра Ніна, — кажа: бабцю, даруйце, бо тая к... яе заб'е. А хто такі к...а? Матка мая! — кажа ўнук. — Гэта бабця мяне выхавала, а не яна... Колькі таго жыцця пражыла, і такая спакойная, нікуды носа не сунула, як то некаторыя хочуць „жондзіць", распіхаюцца ў жыцці. А і я з ёю ад маленькасці — як з другою мамаю. Дзе мы не былі разам! Па якіх работах мы не хадзілі! І так дбала аб мяне, каб мне лягчэй было. І ў *жандовым* лесе працавалі, і дзе ў каго жалі... Залаты чалавек. Двух сыноў мела, адзін сын у Бельску ў скорай ездзіў, раптам памёр. Не было так, каб Люба на каго закляла ці аблаяла кагосьці.

— Праз тыдзень, калі мы сюды яе прывезлі, — успамінае Оля, — прыехала я з Колем да яе, паглядзець. А Люба кажа: „Мне тут як на вяселлі: усё гатова. Я ўжо забыла, што такое „б. старая, к. старая". Бо як сын памёр, нашто яна была той патрэбная. Ды і мы старыя ўжо, недалужныя, нам ужо трэба дапамогі.

Коля забраў быў маці ў Гдыню, ды не магла там вытрымаць. Адчувала сябе як у клетцы. Найбольш растрывожылася, калі забраў яе на паказ працы выратавальных вадалазаў. Адзін з вадалазаў нырнуў па ключ, укінуты камандзірам у мора, выйшаў, пацякла яму з носа кроў. „Ты, сынок, крыўдзіш, забіваеш людзей!" — усхвалявалася маці. І так захацелася ёй у родную старонку, не стрымаць! І сёння, успамінаючы, што ўсё ж ёй 100 гадоў (пару дзён раней, дзень па Пакрове), і госці да яе прыехалі, і ў яе новы, прыязны дом, дзе ёй усе дагаджаюць, усё кажа: „Вось едзем, у Галадах будзеце мець стогадовую бабу", „Ой, каб вы дажылі маіх ста гадоў; мусіць няма старэйшага тут ад мяне" і зараз жа заглыбляецца ў зусім свае думкі. І тарты, і кветкі, і канверты з віншаваннямі ды і з немалым падарункам ад КРУСу, спевы сяброўак і сяброў з „Ракітніка" ды дзетак з белавежскай школы, якія заўджы прыходзяць з падарункам на юбілеі — усё як быццам бы далёка, далей, чым тыя гады, перажытыя на сібірскіх, шчытоўскіх і галадоўскіх нівах, у турботах і радасцях...

Слухай сваё

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

на новай частаце 98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

98,1 FM

новая частата !!!

Мы даступныя кругласутачна ў Інтэрнэце!

www.racyja.com

Адрас:
Białoruskie Radio Racja
ul. Ciepła 1/7
15-472 Białystok
e-mail: radioracja@wp.pl
tel. 085 654 51 93

Рэклама

Авечым шляхам

Многа стагоддзяў мы некуды ідзем. Невядома куды, мы нават не вызначыліся, хто ж мы. Гэта ва ўсходніх суседзяў цэнтральныя пытанні „Што рабіць?” і „Хто вінаваты?”. У нас зусім іншыя — „А хто там ідзе?” і „Хто смяецца апошнім?”. Расія — гэта агромністая раўніна, па якой носіцца ліхі чалавек. Па Беларусі так не палётаеш. Рэдкі паветраны шар даляціць да сярэдзіны Белавежскай пушчы!

Белыя плямы, чорныя дзіркі, выдраныя старонкі, забытыя імёны, невядомыя падзеі — кароткі нарыс айчыннае гісторыі. Курапаты — дарога смерці. Дзяды — дарога жыцця. Асветнікі нашы ў магілах. Магілы — наша асветніцтва. Кола замкнулася, але круціцца далей. Гэта ў іншых народаў гісторыя развіваецца па спіралі, у нас яшчэ і па „вертыкалі”. Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталіся пот і кроў.

Наша салідарнасць здавён дрэмле як здзірванелы курган векавечны. Калі дрыгавічы дрыжаць, радзімічы радуюцца, калі палачане плачуць, тураўцы смяюцца. Крывічы крывяцца. Чарнобыльцы ў зоне, беластачане ў гета.

Мы самая адукаваная нацыя. Ад езуіцкіх і піярскіх калегіумаў да спадарожніка-нацыянальнай бібліятэкі і піяр-тэхналогій. Сімяон Полацкі вучыў Пятра Першага, Шушкевіч — Лі Харві Освальда, Трашчанок — Лукашэнку. Хто болей маці-гісторыі вінен?

Мы — жалезная нацыя — на вачах у людзей не адцураемся камсамольскага білета, не пакідаем мовы нашай беларускай, толькі дзеля таго, каб не ўмерці. Мы маўчым, маўчым, трываем, але толькі да пары. Вось дачакаемся залацістага яснага дня і ўсе ў ружжо. Касінеры Ясінскага і араўканы Дамейкі, дзецюкі Каліноўскага і гавайцы Судзілоўскага, хлопцы Балаховіча і бэнээфаўцы Пазьняка. Сустрэнемся на барыкадах, абы дажыць да світання. Ад філаматаў да мітрапаліта Філарэта. Дайце нам бочку кагору і мы перавернем увесь свет! Мы і так яго перавярнулі. У імя Айца і Сына і Трэцяга Рыма. Якая эвалюцыя! Гуманіст Гусоўскі пісаў вершы на лаціне, а гаўляйтэр Кубэ ўжо па-беларуску.

Наш беларускі след пад сінім небам паўсюдна — паміж пяскоў Эгіпецкай зямлі і ў краіне райскай птушкі, за морам Хвалынскім і ў Альпах, у краіне светлай ля белай бухты і ў Кардыльерах, ад родных ніў і водаў Нёмана — да берагоў Ціхага акіяна.

Урэшце мы выйдзем шчыльнымі радамі. Пінская шляхта і слуцкія ткачыхі, мсціслаўскія недасекі і шклоўскія фальшываманетчыкі, палескія рабінзоны і белавежскія зубры. Бо старадаўняй крывіцкай Пагоні не разбіць, не спыніць, не стрымаць. Усе мы ляцім да зор — дзіркі ў небе маўклівы дакор. Багдановіч быў першым беларускім нудыстам — буду ў далёкім краі я нудзіцца. Аголенасць душы не схаваеш пад вокладкай. „Вянок” на „Сцяне” — ад Багдановіча да Быкава. Ад Бядулі — да Брыля. Ад „Знаку бяды” да „Цынкавых хлопчыкаў”...

На гэтай зямлі адбыліся лёсаносныя падзеі для гісторыі старога свету: Крэўская унія і Віскулёўскія пагадненні. Паміж імі Нямы сойм і Курлоўскі расстрэл, Бярэзінская пераправа і Бабруйскі кацёл. Самагубства Рэйтана і выбух Грынявіцкага як вынік нацыянальнага адчаю. Павешанне Каліноўскага і расстрэл Філістовіча як замацаванне акупацыі. Галоўнае, што рэшта пайшла звыклым авечым шляхам. Разумных бараноў увогуле нямнога. Хітрыя трапляюцца. А дурных не ўсіх вайна пабіла. Вайна — гэта наш адвечны шанц. Шанц памяняць адну акупацыю на іншую. Кепскую акупацыю на горшую. Які нацыянальны гонар — кожны трэці загінуў! А гэта значыць — кожны трэці страляў. Трэцяе пакаленне, трэці райх, трэцяя ракета, тройка энкавэдыстаў. Астральная лічба 3. У сярэднявеччы — Трэці Статут, у дваццаць першым стагоддзі — трэці прэзідэнцкі тэрмін. Нікуды ад гэтай тройкі не падзецца. Гэта ў іншых „птица-тройка” нясецца. У нас жа заўсёды раскіданае гняздо — плач перапёлкі, жураўліны крык, нерухомыя вочы савы. У гэтай краіне не маем мы дому. Проста людзі на балоце.

Так што пакуль суцэльныя хмары і здані. Дзікае паляванне караля Стаха і эскадрон смерці Паўлічэнкі. Чорны замак Альшанскі і Белы сон. Гадзіннік спыніўся апоўначы...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Рэтра-транспарт (1)

Прыезд у Гайнаўку напаўняе мяне нейкай своеасаблівай увагай. Дзеецца мо гэта таму, што Гайнаўка была маімі дзвярамі ў свет. Таму на змены, што адбываюцца ў ёй, гляджу я не як на нейкія маршчыны, але як на павуцінне, якім зараз тыя дзверы зацягваюцца, так як забіваюцца дошкамі дзверы ў шматлікіх нашых вясковых хатах. Езджу я ў тую маю Гайнаўку на публічным транспарце і прыём гэтага транспарту горадам не развесяляе.

Вось у сераду, 14 лістапада, намеціў я свой маршрут у Орлю праз Гайнаўку менавіта. Заехаў прыватным бусікам, злез у цэнтры горада і падаўся на вакзал побач гарадскога парку. Гайнаўскія чыгуначныя прасторы выглядаюць па-асенняму асабліва восенню. З гэтага боку чыгуначнага палатна, што між вакзальнымі будынкамі і цэнтрам горада, з ранейшых васемнаццаці пуцей зараз прысутнічае чатырнаццаць. І з гэтага ліку восем зарастае тым, што Усявышні сотворыл во третий день по Писаниемъ; шэсць яшчэ не выйшла „на пенсію”...

Пяцьдзесят гадоў таму бульдозеры рылі ўзгорак, які гэтак выкапаным абрывам вісіць над пуцямі, што губляюцца ў бок Чаромхі. Сорак гадоў таму з пераезда, што паблізу касцёла, лакаматывы распасоўвалі таварныя вагоны па тых амаль дваццаці парах рэек. І тыя вагоны з меншым або большым грукатам „віталіся” са сваімі новымі суседзямі па таварных эшалонах. Трыццаць гадоў таму на насыпе каля віядука, што паблізу сабора, будавалася „карусель” для распасоўкі лакаматываў. Тлум народу клубіўся днём і ноччу ў правізорным чыгуначным вакзале з драўляных дошак. Дваццаць гадоў таму кішма народу клубілася на аўтобусным вакзале ў будынку ПЗГСу, а аўтобусы пераадольвалі „рэйдавыя” калдобіста-балотныя спец-адрэзкі пад'язджаючы да платформаў. Людзі валілі валом праз тадышнія вокны і дзверы Гайнаўкі на свет. Той час мінуў. Няма ўжо і ПЗГСу, і будынка, які ён займаў. Няма і чыгуначнага барака, і па „каруселі” след прапаў. Няма ў Гайнаўцы эшалонаў, няма тлумаў на вакзалах. Тыя тлумы паязды і аўтобусы паразвозілі па свеце, падрэзваючы гэтакім чынам рала, на якім яны трымаліся.

Гайнаўскі аўтобусны вакзал нейкі час быў субкватарантам новага чыгуначнага, але сёння чыгуначны „кватаруецца” самотна. У пачакальні астаўся толькі раскład аўтобусаў, аўтобусная каса расплылася ў нябыт. Працуе адно каса з чыгуначнымі білетамі, а дакладней кажучы — касірка. На чыгуначным раскладзе шэсць паяздоў у Чаромху, з якіх два едуць далей — у Седльцы, а адзін з іх нават у Варшаву. Пяць з іх — невялікія рэйкавыя аўтобусы ды і „варшавяк” мабыць не надта большы за іх. У гэтых „цягніках” ездзіць — аптымістычна мяркуючы — па больш-менш дваццаць пасажыраў плюс машыніст з праваднікам, які мае правяраць прададзеныя касіркай білеты. Ці выручаныя ад продажу білетаў грошы кампенсуюць зарплаты касірцы і праваднику — згадваць не стану. Але заміж гэтага можна паставіць пытанне: ці не вазіць той горсткі пасажыраў дармова дагаворным прыватным транспартам? Можа і можна было б, толькі тады непатрэбныя былі б касіркі, непатрэбныя былі б праваднікі, непатрэбныя былі б бухгалтары, што ім падлічваюць зарплаты, непатрэбныя былі б іншыя чыноўнікі. І як упаў бы тады ранг чыгуначнага дырэктарства. І чаго яно магло б тады патрабаваць ад, напрыклад, маршалкоўскай управы? Такім чынам касірка з праваднікам, якія амаль нічога не робяць, своеасабліва шабашнічаюць на аклады чыгуначнай вярхушцы. А грошы ад маршалкоўскай управы і так „паньствовыя”...

У пачакальні яшчэ дзве білетныя касы, абедзве „do wynajęcia”. На антрэсолі кіёск з выбітай шыбай. Праходы, што не на пероны, закрытыя дзвярамі з жалезнай краты, прыводзячы ўражанне, быццам чакаючыя пасажыры апынуліся ў клетках як звяры ў цырку або заапарку. Можа гэтак і павінна быць у Гайнаўцы дзеля прадчування абгароджаных пушчанскіх запаведнікаў. Чалавек жа з'яўляецца неад'емнай часткай прыроды...

Што ж тады дзеецца з Гайнаўкай сёння, або нават лепш будзе спытаць, што з ёй сталася ў мінулым — адкуль гэтая „дама” ўзялася і куды яна набірае разгону зараз? Хто б у шырокім свеце чуў пра Клондайк, калі б у 1896 годзе не былі там знойдзены багатыя залатыя крыніцы? Ці стала б Гайнаўка горадам, калі б дваццаць гадоў пасля Клондайка практычныя немцы не адкрылі ў яе наваколлі багатых крыніц драўніны? І так пайшло-паехала — Гайнаўка стала свайго роду факторыяй, фарпостам прамысловай рэвалюцыі на подступах да Белавежскай пушчы. Цяпер, аднак, здабыча драўніны з Белавежскай пушчы скарачаецца, скарачаецца насельніцтва так Гайнаўкі, як і цэлай Гайнаўшчыны. Гэты напрамак мясцовага дэмаграфічнага „разгону” відаць як на далоні на гайнаўскім вакзале.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Аб Шэнгене і камісіі

І здарылася. Еўрапарламент адобрыў факт уваходу з 21 снежня 2007 г. Польшчы і васьмі іншых членскіх краін у Шэнгенскую зону. Між іншым польскія грамадзяне без перашкод змогуць падарожнічаць па ўсіх еўрасаюзных краінах. Усё ж, аднак, у гэтым кантэксце польскія ўлады не ўнармавалі праблемы кантактаў з Беларуссю. Як пісала адна з найбольшых цэнтральных газет у Варшаве, зараз жа да адыходу ўрада, кіраўнік МЗС Анна Фатыга мела выдаць распараджэнне, у якім вызначыла цану за польскую візу для ўсходніх суседзяў. Візы для расіян і ўкраінцаў маюць каштаваць 35 еўра, а для беларусаў — 60 еўра. Аднак г.зв. нацыянальная віза (для студэнтаў ды асоб, якія маюць дазвол на працу і сем'і ў Польшчы або магілы блізкіх) — згодна з задумай міністр Фатыгі — мела б каштаваць яшчэ больш, бо 75 еўра. Газета, якая аб гэтым інфармавала, сцвердзіла: „Іншыя краіны націскаюць на нас, каб нацыянальных віз выдаваць як найменш, бо частка асоб, якая іх атрымае, рушыць нелегальна на Захад, бо не будзе памежнага кантролю”.

Задзіўляючыя, сапраўды, ідэі. Генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык уваход Польшчы ў Шэнгенскую зону пракаменціраваў наступным чынам:

— Гэты факт ударыць перш за ўсё па звычайных грамадзянах нашых краін, турыстах, старэйшых людзях, якія пасля 65 года жыцця атрымлівалі бясплатныя візы, падобна як моладзь да 16 года жыцця. Не ведаю чаго Захад баіцца. Ну, не паедуць беларусы на Захад на пастаяннае жыхарства. Добрыя спецыялісты і ў Беларусі атрымліваюць добрыя грошы. Беларусы прывыклі жыць на сваёй зямлі і, як вядома, у свеце іх няшмат. Асноўная маса пражывае на зямлі сваіх бацькоў і дзядоў.

Зацікавіў мяне іншы аспект уваходу ў Шэнгенскую зону — чыгуначны. Як вядома, у апошнія гады ПКП кіруецца прынцыпам фінансавай выгады пры ўтрымліванні чыгуначных маршрутаў. Можна спадзявацца, што на шляхах ва ўсходнім напрамку, думаю тут асабліва аб маршруце Беласток — Гродна, пасля 21 снежня наступіць рэзкі спад ліку пасажыраў.

Дырэктар Рэгіянальных перавозаў ПКП у Беластоку Альжбета Залуска крыху мяне супакоіла:

— У змененым ад 9 снежня раскладзе руху паяздоў на гэтым напрамку змен не прадбачваем. Прынамсі — пакуль што. Рух тут не можа быць меншы, асабліва пасля ўвядзення Карты паляка.

Мабыць, пытанне вынікаў уваходу ў Шэнгенскую зону (не толькі цэнаў на візы) стане прадметам працы новастворанай, з семнаццаці асоб, сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей. У гэтым скліканні яе старшынёй стаў былы зялёнагурскі ваявода ад ПіС, юрыст Марк Аст. Папярэдне быў ім падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін, які цяпер з'яўляецца віцэ-старшынёй, поруч украінца Мірана Сыча (ГП), немца Рышарда Галя (незалежны) і сілезца Казімежа Куца (ГП).

Такім чынам партыйная структура меншаснай камісіі ў гэты раз складваецца такім чынам: ГП — 8 дэпутатаў, ПіС — 5, ЛіД — 2, ПСЛ — 1, незалежны — 1. Справы меншасцей — як відаць з арыфметыкі гэтай сеймавай камісіі як і ўвогуле, калі глядзець на склад парламента і ўрада — у найбліжэйшыя гады найбольш праўдападобна будуць залежаць ад Грамадзянскай платформы, якой падляшскі старшыня дэпутат Роберт Тышкевіч, дагэтуль у Сейме старшыня групы па справах Беларусі, стаў віцэ-старшынёй камісіі па замежных справах.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Прыбылі за дапамогай

Аляксей МАРОЗ

Заўсёды 8 лістапада многа людзей збіралася на горцы ў Саках, дзе знаходзіцца царква велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага. У час святкаванняў у гонар гэтага святога людзі прыязджалі, каб памаліцца перад яго цудатворнай іконай. Калі ў Саках узнік мужчынскі манастыр, ікону велікамучаніка Дзімітрыя пачалі ў час святкаванняў выносіць з-за алтара на сярэдзіну храма і стала яшчэ большаць колькасць паломнікаў, што прыбываюць на горку з малітвамі, надзеяй на выздараўленне і атрыманне Божай дапамогі для сямейнікаў. На сёлетняе лістападаўскае святкаванне побач жыхароў навакольных сёл прыбылі пілігрымы з больш аддаленых мясцовасцей Беласточчыны і вернікі з розных куткоў Польшчы. Людзі, якія не памясціліся ў невялікай царкве, слухалі багаслужбу і маліліся звонку храма. Прыгожа адноўленая царква, асобна збудаваная званіца, сакоўскі могільнік і драўляныя крыжы, якія людзі сталі часцей ставіць на горцы, ствараюць непаўторную малітоўную атмасферу, што таксама заахвочвае да роздумаў і рэфлексій наконт сэнсу людскога жыцця.

На ўсяночную багаслужбу шматлікія паломнікі прыбылі на машынах і аўтобусах, а вернікі з навакольных сёл дабіраліся пяшком і на веласіпедах. Не перашкаджала ім халоднае надвор'е і не напалохаў снег, які выпаў яшчэ перад святкаваннямі, але і хутка знік. Паколькі цудатворная ікона велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага выносіцца з-за алтара толькі адзін раз у год, служылася таксама начная літургія, у час якой перш за ўсё маліліся паломнікі з гарадоў, якія на другі дзень мусілі вяртацца на працу. Раніцай пасля асвячэння вады быў адслужаны малебен з акафістам і вернікі з удзячнасцю за дапамогу велікамучаніка Дзімітрыя з малітвамі на вуснах сталі прыкладацца да яго цудатворнай іконы. Нават каталікі з Сакоў прыйшлі прылажыцца да іконы, бо лічаць, што жаўнер Вежба, які з Дзімітрыеўскай іконай быў перанесены з турэцкай няволі ў родную вёску Сакі, быў каталікам. Галоўную літургію ў саслужэнні святароў многіх прыходаў узначаліў епіскап Сямятыцкі Георгій. У час пропаведзі расказаў ён пра пакутніцкую смерць святога Дзімітрыя Салунскага і ставіў яго адвагу і адданасць свайму веравызнанню ў прыклад для сабраных. Уладыка Георгій гаварыў пра небяспечныя для праваслаўных вернікаў меркаванні, якія штораз часцей знаходзяць прыхільнікаў у Еўропе і на цэлым свеце. Каб супрацівіцца шкодным для хрысціян ідэям, трэба будзе выказацца адвагай і стойкасцю, бяручы прыклад з велікамучаніка Дзімітрыя. Настаяцель Мужчынскага манастыра ў Саках архімандрыт Варсанофій у час выступлення перад святарамі і вернікамі ўспомніў прысутнага на святкаваннях айца Яўгенія Канаховіча. Кожны год стараецца ён прыехаць на дзімітрыеўскае свята, каб падзякаваць святому за вялікую жыццёвую дапамогу — аздараўленне перад цудатворнай іконай у Саках, што здарылася ў яго дзяцінстве. Калі непрытомнага хлопчыка прывезлі ў царкву пасля таго, як конь ударыў капытом у ягоную галоўку, бацькі сталі маліцца перад іконай святога Дзімітрыя і прылажылі дзіця да іконы велікамучаніка. Маленькі Яўгеній адразу аздаравеў і стаў хадзіць па царкве. Хаця сёлета айцец Яўгеній не выступаў з пропаведзю, успомніўся мне яго двухгадовай даўнасці заклік не саромецца сваёй мовы і вучыць дзяцей размаўляць на роднай гаворцы. Сказаў ён тады, што людзі, як расліны без каранёў, будуць засыхаць без сваёй мовы. Праўда, яшчэ жыхары Сакоў і Тапаркоў, якія састаўляюць невялікі манастырскі прыход, гавораць на роднай мове, але і тут стала пашырацца „мода" гаварыць да сваіх наймалодшых дзетак папольску. Хаця архімандрыт Варсанофій з дзяцінства карыстаўся дыялектам падобным на беларускую літаратурную мову, хутка вучыцца таксама гаварыць на сакоўска-тапаркоўскай гутарцы. У час нядзельных пропаведзей архімандрыт Варсанофій успамінае таксама іншыя аздараўленні і дапамогу, якія вернікі атрымлівалі пасля малітваў да велікамучаніка Дзімітрыя. Выпускніца гістарычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку Міраслава Грыгарук напісала пад кірункам прафесара Антона Мірановіча магістэрскую працу „Культ святога мучаніка Дзімітрыя Салунскага на Падляшшы", у якой змясціла таксама аповеды аб цудоўных аздараўленнях і дапамозе велікамучаніка для людзей. Перад сёлетнім святам у Супрасльскім манастыры была надрукаваная кніжка, у якой да магістэрскай працы былі далучаны здымкі са святкаванняў у Сакоўскім манастыры і прыходзе. Магістэрская праца ўтрымлівае звесткі з жыцця і смерці святога велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, інфармацыю аб яго цудатворнай сакоўскай іконе і кульце святога на Падляшшы. У ёй можна таксама знайсці гістарычныя інфармацыі аб манастырскім жыцці на Падляшшы, Сакоўскім прыходзе, яго царкве і новаадчыненым Мужчынскім манастыры ў Саках. У працы Міраславы Грыгарук і выдадзенай кніжцы знаходзяцца таксама акафіст да велікамучаніка Дзімітрыя і канон у яго гонар. Кніжку вельмі ахвотна куплялі паломнікі і прыхаджане. Покі ўзяў я ў рукі работу Міраславы Грыгарук, ад вернікаў Сакоўскага прыхода даведаўся аб шматлікіх выпадках дапамогі велікамучаніка Дзімітрыя вернікам.

— Нашы людзі, выязджаючы ў бежанства, узялі з сабой цудатворную ікону велікамучаніка. Калі вярталіся дамоў, загарэўся цягнік. Ацалеў толькі вагон, у якім ехалі жыхары Сакоў з цудатворнай іконай. Для матушкі Марыі Кудраўцавай пасля малітваў перад цудатворнай іконай перастала балець нага. Пазней матушка спісвала і апісвала выздараўленні іншых людзей ад розных хвароб, якія адбываліся пасля малітваў да велікамучаніка Дзімітрыя, — расказвалі жанчыны з Тапаркоў. Аздараўлівалі таксама некаторыя жыхары Сакоў і Тапаркоў пасля гарачых малітваў перад іконай велікамучаніка.

Прыхаджане з Тапаркоў і Сакоў лічаць, што гэта па хадайніцтве велікамучаніка Дзімітрыя засеялася манаскае жыццё, спачатку ў Саках, а нядаўна ў Залешанах. Калі кляшчэлеўскім гмінным уладам не ўдавалася прадаць вялікі мураваны будынак, які пуставаў пасля закрыцця Падставовай школы ў Саках, паявілася прапанова перадаць яго на патрэбы мужчынскага манастыра, які толькі што ўзнікаў на аснове невялікай царквы, распаложанай на горцы, і невялікага прыхода. Хаця цана за будынак была невялікай, прыйшлося збіраць грошы на яго куплю сярод прыхаджан, якія хацелі жыць побач будучага манастыра.

— Спачатку мы не мелі дзе затрымацца, але сустрэлі Любу Рошчанку, якая прыняла нас на кватэру. Пасля была прапанова купіць будынкі былой школы і мы ёй пакарысталіся, — успамінаў раней архімандрыт Варсанофій.

У купленым будынку адразу распачаліся рамонтныя работы, якія працягваюцца па сённяшні дзень за ахвяраванні прыхаджан, паломнікаў і людзей добрай волі з усяго свету. Спачатку вялікі мураваны будынак быў рамантаваны ўсярэдзіне. Знаходзіцца ў ім манастырская царква, у якой манахі і паслушнікі моляцца штодзень. У святочныя дні манахі разам з прыхаджанамі моляцца ў царкве на горцы. Два гады таму пачалі перакрываць бляхай дах манастырскага будынка, а пасля ўставілі на паддашку вокны, каб можна было прыстасаваць распаложаныя там памяшканні для манастырскіх патрэб. Пазней рамонтныя работы ў Саках абмежаваліся, толькі быў перароблены і рамантаваны мураваны будынак у Залешанах, адкуплены на патрэбы паломніцкага дома. Аднак пасля гэты дом быў перададзены на патрэбы Жаночага манаскага дома, які летам гэтага года пачаў дзейнічаць у Залешанах (пісалі мы аб гэтым у размове з ігуменняй Елізаветай).

Намеснік Мужчынскага манастыра ў Саках архімандрыт Варсанофій напамінае, што велікамучанік Дзімітрый штодзень дапамагае мясцовым манахам, якіх колькасць пабольшала да пяці чалавек, калі 14 кастрычніка протаіерэй Андрэй, які жыве ў манастыры з вясны гэтага года, быў пастрыжаны ў малую схіму з іменем Сцяпан. Манастыру дапамагаюць таксама прыхаджане, якія выконваюць менш складаныя работы і пастаўляюць у манастыр харчаванне. Збіралі яны грошы на прыхадскія патрэбы пры нагодзе калядавання ў сваіх і суседніх вёсках. У Сакоўскім манастыры манахі пачалі крыху займацца гаспадараннем з выкарыстаннем трактара, які атрымалі ад прадпрыемства „Пронар" з Нарвы, завялі пчол. Рамонтныя работы ў манастырскім будынку будуць яшчэ працягвацца.

Лістападаўскія святкаванні закончыліся хрэсным ходам. Калі свяшчэннікі і вернікі выйшлі з царквы, далучыліся да іх людзі, якія ў халодны дзень маліліся звонку, а ўсярэдзіну храма заходзілі, каб прылажыцца да цудатворнай іконы. Людзі раз'язджаліся дамоў з асвячонай вадой і надзеяй на пераадоленне розных жыццёвых цяжкасцей з дапамогай велікамучаніка Дзімітрыя.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Да цудатворнай іконы велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага прыкладваліся старэйшыя і маладыя людзі, а ўсе яны звярталіся з нейкай просьбай

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У час хрэснага ходу прыхаджане і паломнікі маліліся вакол адноўленай звонку царквы

Хуліганаў лавіце самі

Вечарам 8 лістапада г.г. прыйшоў я на аўтобусны прыпынак ПКС каля касцёла па вул. 3 Мая ў Гайнаўцы. Чакаў я „свайго" міжгарадскога аўтобуса, які ад'язджае з Гайнаўкі а 18 гадзіне. Чакала яшчэ некалькі старэйшых асоб і шмат моладзі. У тэлефоннай будцы сядзела сабе маладая дзяўчына з хлопцам і дзіўна захоўвалася. Нагамі ўпіралася яна ў юнака. Клікала юнакоў, якія якраз ішлі па другім баку маставой. Яшчэ іншыя дзяўчаты стаялі побач, рагаталі, пасвіствалі.

Раптам дзяўчына ў будцы зняла тэлефонную трубку і пачала біць ёю аб сценку. Я падышоў да будкі і пачаў яе папракаць, каб не нішчыла тэлефона.

— Co pani robi? — звярнуўся далікатна да яе. — Pani niszczy aparat, który może się przydać w pilnej potrzebie!

— A co?! — з'едліва паглядзела на мяне дзяўчо. — Słuchawka sama spadła!

— Może pani opuści budkę, — не ўступаў я.

Ніхто мяне не падтрымаў, не заступіўся. Калі я толькі адвярнуўся, пачуў брыдкае слова, якога не буду паўтараць. Гэта адначасова быў загад, каб я адступіўся і пайшоў сабе прэч. Моладзь зарагатала, заіржэла. Мне навука: не звяртай увагі маладым! Хацеў я пазваніць на паліцыю, але часу не хапіла. Якраз пад'ехаў аўтобус.

А ў сваю чаргу. Чаму цяпер няма на вуліцах паліцэйскіх патрулёў? Раней яны былі. І было куды бяспечней ісці вечарам ці ноччу.

Навасады
Новая святліца

Даўно таму ў вёсцы Навасады (Гайнаўскі павет) быў клуб „Рух" і ён добра працаваў. Але яго закрылі. Будынак быў у дрэнным тэхнічным стане. Апрача таго ён знаходзіўся на павароце рухлівай вуліцы. Сюдою ездзяць аўтамашыны з Гайнаўкі ў Беласток цераз Нарву ды ў Нараўку і ў Міхалова, а таксама назад.

Зараз у Навасадах вельмі прыгожа аднавілі будынак былой драўлянай пачатковай школы. Вельмі трапна падабралі колеры сцен і вокнаў. Будынак знаходзіцца воддаль ад вуліцы. У ім будзе адкрыта святліца і пункт турыстычнай інфармацыі. Калі ўжо будзе клубнае абсталяванне, тады будуць тут збірацца і моладзь, і старэйшыя жыхары гэтага вялікага сяла.

Варта адзначыць, што ўлады Гайнаўскай вясковай гміны дбаюць пра сельскія святліцы. У ліпені 2006 года адкрылі яны новую святліцу ў будынку колішняй школы ў Барысаўцы.

Шафёры — курцы

5 лістапада г.г. ездзіў я пасажырскімі аўтобусамі ПКС з Ляўкова ў Беласток і назад. Выехаў раніцай а гадзіне 7^{16} і вярнуўся з Беластока а гадзіне 14^{07}. Аўтобусны маршрут з Гайнаўкі ў Беласток і з Беластока ў Гайнаўку пралягае цераз Міхалова.

І раніцай, і пасля абеду вадзіцелі аўтобусаў ПКС курылі папяросы падчас язды! Надыхаўся я горкага дыму, асабліва ў пасляабеднім аўтобусе, які вёў малады шафёр. Ці гэтак можна атручваць пасажыраў?

Хацеў я для дакладнасці запісаць рэгістрацыйныя нумары аўтамашын, але аказалася гэта немагчымым — дошкі з нумарамі былі запыленыя і пакрытыя засохлым балотам. **(ян)**

Культура ў Заблудаве

Размова з выконваючай абавязкі дырэктара Гарадскога асяродка анімацыі культуры ў Заблудаве Цэцыліяй ГАЛІЦКАЙ.

— ***Якія галоўныя мерапрыемствы ў гадавым маштабе праводзіць Ваш асяродак?***

— Галоўным мерапрыемствам з'яўляюцца Нарадзіны Заблудава — сёлета мінула 454-я гадавіна заснавання нашага горада — якія арганізуем у першую нядзелю пасля 15 жніўня. Гэта мастацка-адпачынковае мерапрыемства з кірмашом у амфітэатры ў Замкавым парку. Стараемся тады паказаць розныя жанры музыкі, так польскай, як і беларускай. Маем тут і народную музыку, і папулярную, і шанты, і блюз, і лёгкі джаз... Выканаўцамі з'яўляюцца калектывы так звонку, напр. з Гданьска ці Любліна ды суседніх гмін, як і ўласныя. Два гады таму выступалі ў нас „Мэрэчанкі" з Беларусі; за апошнія дзесяць гадоў былі яны ў нас тройчы. Сёлета зоркай імпрэзы была Малгажата Астроўская. Знамянальнай падзеяй мерапрыемства з'яўляецца выкананне гейнала Заблудава — „Kiedy ranne wstają zorze" Францішка Карпінскага, які быў нейкі час пражываў у Заблудаве.

Апрача мастацкай часткі адбываюцца таксама спартыўныя спаборніцтвы: футбольныя матчы, шахматны турнір імя караля Жыгімонта Аўгуста, на які арганізатарка нашага шахматнага жыцця Эмілія Каханская запрашае гасцей звонку — з Гайнаўкі ці Сямятыч. Адбываюцца таксама тэнісныя спаборніцтвы за кубак бурмістра Заблудава. А для дзяцей арганізуем г.зв. дзіцячую вёску з рознымі гульнямі і — заўсёды — з тэатральным спектаклем.

Апрача Нарадзін Заблудава наш асяродак з'яўляецца яшчэ суарганізатарам мерапрыемстваў, якія ладзяць нашы вясковыя грамадскасці. У іх ліку Сямейны фэст у Кур'янах, які адбываецца ў маі. Спартыўна-адпачынковы фэст ладзяць жыхары Звяркоў на Сёмуху. У палове ліпеня адбываецца таксама фэст у Галіцкіх. У верасні ў Рыбалах адбываецца Свята ўраджаю, аднак сёлета адбылося яно на Пакрову. У канцы кастрычніка ў Фальварках-Малых адбываюцца Дакопіны.

У нашых мясцовасцях адзначаем таксама Дзень дзіцяці — у Заблудаве, Загрушанах і Рахвалаўцы. Сёлета ладзілі мы таксама юбілей 500-годдзя Заблудаўскага праваслаўнага прыхода.

— ***А якія заняткі пастаяннага характару праводзіць Ваш асяродак?***

— Гэта музычныя заняткі: навука ігры на клавішных інструментах і на гітары. Наш музычны калектыў праводзіць рэпетыцыі раз у тыдзень, а калі трэба то і часцей. Тэатральны гурток займаецца раз у тыдзень.

Працуе ў нас таксама мадэльны гурток. Маладыя заўзятары гэтага мастацтва выканалі ўжо макеты нашых капліцы, сінагогі, царквы і касцёла. Па суботах прыязджае да нас спадар Наумюк, які вучыць ахвотных разьбе па дрэве.

Пластычныя заняткі адбываюцца ў дзвюх узроставых групах — два разы ў тыдзень і трэці раз у Рахвалаўцы, дзе ўдзел прымаюць таксама вучні школы ў Дабрынёўцы.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Шахматысты практыкуюцца ў дзвюх групах: пачаткоўцаў і перадавікоў. У нашым асяродку дзейнічае таксама група валанцёраў, якая памагае арганізаваць нам мерапрыемствы ды нясе дапамогу сябрам і пажылым людзям. Раз у тыдзень адбываюцца сацыятэрапеўтычныя заняткі з гульнямі і падкормам дзяцей.

Па меры патрэб ладзім таксама курсы англійскай мовы.

— ***Якія мастацкія калектывы дзейнічаюць пад апекай Вашага асяродка?***

— Гэта, у першую чаргу, вядомы ў беларускім асяроддзі вакальны калектыў „Рэчанька" з Козлік пад кіраўніцтвам Алы Каменскай. У Заблудаве працуе маладзёжны музычны калектыў пад кіраўніцтвам Рамуальда Ажлянскага. Плённа дзейнічае наш квартэт акардэаністаў пад кіраўніцтвам Ежы Крушэўскага, які, напрыклад, сёлета трэці ўжо раз выйграў фестываль у Васількаве. У Фальварках-Малых дзейнічае фальклорны ансамбль „Фальварчанкі" пад кіраўніцтвам Мечыславы Турасенскай. У Вясковым доме культуры ў Рыбалах пад кіраўніцтвам Лідзіі Мартынюк працуе танцавальны калектыў „Рыбалкі". У Звярках дзейнічае танцавальны калектыў „Zevirki" пад кіраўніцтвам спадарыні Бялецкай.

Асобную ўвагу трэба адвесці нашай інструктарцы пластыкі Кацярыне Пуры. Свае ўсебаковыя зацікаўленні перадае яна нашым дзецям. Яна з'яўляецца выпускніцай бельскай школы іканапісу і гэтаму мастацтву навучае сваіх мясцовых падапечных. Дзеці, абодвух канфесій, пішуць іконы пакуль на кардоне і вынікі гэтай працы даволі перспектыўныя. Таксама ўдзельнікі пластычнага гуртка размалёўваюць пейзажы Заблудава на талерках, карыстаючыся фарбамі для шкла. Маладыя мастакі вучацца таксама выпальванню пейзажоў у драўніне. Дзеля падбадзёрвання іхніх зацікаўленняў наш асяродак арганізуе трохдзённы пленэр у Рахвалаўцы, які з'яўляецца вялікім атракцыёнам для маладых пластыкаў.

— ***Вы нічога не згадвалі пра „Хлопцаў-Рыбалоўцаў"...***

— Яны спынілі сваю дзейнасць.

— ***Якімі аб'ектамі распараджаецца Ваш асяродак?***

— Гэта база Гарадскога асяродка анімацыі культуры ў клубе „Pod Burmistrzem", якая знаходзіцца ў падвале будынка Гарадской управы. Маем таксама вясковыя дамы культуры ў Рахвалаўцы, Рыбалах і Крыніцкіх ды святліцу ў Галіцкіх. Падтрымліваем таксама вясковы клуб у Дабрынёўцы ды святліцы ў Фальварках-Малых, Звярках, Кур'янах і Паўлах. У вясковых дамах культуры працуюць штатныя інструктары, установы вядуць дзейнасць, у прынцыпе, штодзённа, найчасцей у пасляабедні час. Вядуць яны розныя заняткі, кожная ўстанова выпрацавала свой профіль, які найлепш прыняўся ў даным асяроддзі.

— ***З якімі іншымі суб'ектамі супрацоўнічае Ваш асяродак?***

— Колу пенсіянераў даем для карыстання нашы памяшканні, у меру патрэбнасцей даем ім таксама транспарт. Мясцовым ветэранам дапамагаем у арганізацыі іхніх святкаванняў. Са школамі ладзім сумесна розныя мерапрыемствы, напрыклад, гімназіяды ці гарцэрскія кросы. Шэфствуем спартыўнаму клубу „Рудня" ў Заблудаве і гурткам ЛЗС у паасобных мясцовасцях. У Рахвалаўцы працуе згуртаванне „Барва", якое ставіць сабе мэты падобныя да колішніх колаў вясковых гаспадынь, але вышэйшага палёту. Таксама розным суб'ектам з тэрыторыі Заблудаўскай гміны дапамагаем здабываць сродкі, развіваць уменні. Спрыяем паўстаючым рэгіянальным залам ды агратурызму. Таксама ў коле нашай увагі арганізацыя „сібіракоў", з якой ладзім гадавіну пасляваеннай вывазкі на „Нялюдскую зямлю" ўсіх жыхароў вёскі Заціша.

Супрацоўнічаем таксама з парафіямі з нашай тэрыторыі. Летась прынялі мы ўдзел у святкаваннях 200-годдзя заблудаўскага касцёла, а сёлета — у святкаванні юбілею 500-годдзя праваслаўнага прыхода ў Заблудаве; з апошняй нагоды наш асяродак выпусціў памятны медаль. З удзелам духавенства ладзім таксама калядную вячэру, у якой прымае ўдзел каля трыццаці адзінокіх асоб з самога Заблудава, бо з іншых мясцовасцей складаны транспарт.

Важным нашым партнёрам з'яўляюцца пажарнікі, з якімі суарганізуем тэматычныя конкурсы. Сёлета трое нашых дзяцей выйшла ў ваяводскі фінал пластычнага конкурсу на тэму супрацьпажарнай аховы.

Трымаем кантакт з Беларускім грамадска-культурным таварыствам і згуртаваннем „Wspólnota Polska". Гэтыя арганізацыі спрыяюць нашаму культурнаму абмену з замежжам ды арганізацыі нашых мерапрыемстваў. Напрыклад, калектыў „Рэчанька" двойчы пабываў у Гродне. А вось нядаўна гэты ж калектыў выступаў у Мінску-Мазавецкім, дзе заняў першае месца ў катэгорыі мастацкіх калектываў і другое за „хлебны стол".

На тэрыторыі нашай гміны маем шмат народных умельцаў, якія далучаюцца да нашых мерапрыемстваў. Займаюцца яны м.інш. мастацкім кавальствам, саломапляценнем, вышыўкай, вязаннем, ткацтвам, вырабам кашоў. У іх ліку м.інш. Люба Гаўрылюк з Козлікаў і Уладзімір Наумюк з Канюкоў.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Міхал Аляксейчык: — Заўсёды прапаную нашым бізнесменам не ехаць у ЗША, Канаду, Францыю ці Галандыю, а ў Польшчу, на Беласточчыну. Маем тут падобныя мовы і шмат супольнага, хоць бы звязанага з сем'ямі і знаёмымі па абодвух баках нашых межаў...

Не толькі пра смецце

фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Злева: дырэктар фірмы „Аства" Станіслаў Лунеўскі, бізнесмен Лех Пілецкі, генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык і консул Наталля Міськевіч

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Гэта былі пераломныя сустрэчы, прадказваючыя новы этап супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Польшчай, прынамсі ў яе геаграфічным паўночна-ўсходнім, а дакладна беластоцка-гродзенскім маштабе. У Беластоку пабывала пад дваццаць прадстаўнікоў камунальных устаноў Гродна і Гродзенскай вобласці, якія знаёміліся з вырашэннямі наконт складвання, утылізацыі і перапрацоўкі бытавых адыходаў.

На працягу двух дзён беларускія госці наведалі склад адыходаў у Грыневічах і фірму асенізацыйных паслуг „Аства", суарганізатара — апрача Падляшскага клуба бізнесу, беластоцкіх самаўрадавых улад і беларускага генконсульства ў Беластоку — іхняй пабыўкі. Удзельнічалі яны таксама ў семінарах, прысвечаных праблематыцы бытавых адыходаў, між іншым клопатам з абясшкоджваннем азбесту і утылізацыяй адпадкаў шляхам спальвання ў Польшчы.

Спасылаючыся на візіт, у размове з „Нівай" генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык сказаў:

— Наша супрацоўніцтва павінна развівацца перш за ўсё шляхам прадпрыемстваў. Заўжды наперадзе палітыкі ішоў бізнес. Было мне крыху крыўдна, калі на гродзенскай гаспадарчай выстаўцы „Еўрарэгіён 2007" удзельнічалі толькі адна ці дзве польскія фірмы, хоць былі аж чатыры дэлегацыі з розных польскіх гарадоў. Мне хацелася б, каб такога тыпу абмены маглі адбывацца як найчасцей. Выгады ад такіх сустрэч бываюць усебаковыя. Сапраўдны польскі бізнес існуе ўжо 15 гадоў. Можам вучыцца ад палякаў, бо яны ведаюць, як пачынаць з нуля. Заўсёды прапаную нашым бізнесменам не ехаць у ЗША, Канаду, Францыю ці Галандыю, а ў Польшчу, на Беласточчыну. Маем тут падобныя мовы і шмат супольнага, хоць бы звязанага з сем'ямі і знаёмымі па абодвух баках нашых межаў.

Дыпламат дадаў яшчэ:

— Я прыкмячаю ў вас праблемы з сельскагаспадарчай перапрацоўчай прамысловасцю. У гэтай галіне бачу вялікае поле для супрацоўніцтва, так як і ў іншых сектарах, непасрэдна блізкіх грамадзянам, якіх вынікі штодзённа выкарыстоўваюцца імі. Вядома, не гавару тут аб хімічай ці нафтавай прамысловасці.

На думку генконсула Аляксейчыка, існуюць розныя палеткі для польска-беларускага супрацоўніцтва, не звязанага з палітыкай. Успомніў ён пра падрыхтоўку да шасцісотгадовага юбілею Белавежскай пушчы ў 2009 г. (лічыўшы ад першых згадак аб ёй).

— Запрашаем, каб польскі бок далучыўся да гэтых падрыхтовак. Некаторыя ўспамінаюць аб пушчы і асацыююць факт яе існавання з камунізмам. А ўзнікла яна ў Вялікім княстве Літоўскім, калі не думалася аб межах паміж намі. Трэба Белавежскую пушчу зноў учыніць супольным скарбам.

Раней перад адным з семінараў у фірме „Аства" (дзейнічае з 1992 г., займаюцца ў ёй каля 90 асоб і мае яна 40 працэнтаў паёў на рынку асенізацыйных паслуг) старшыня Польскага клуба бізнесу Лех Пілецкі заявіў:

— Польскія прадпрымальнікі галодныя кантактаў з Беларуссю. Хочам супрацоўніцтва на прынцыпах роўнасці і даверу.

У сваю чаргу, падагульняючы двухдзённы візіт, консул РБ у Беластоку Наталля Міськевіч сказала нам:

— Гэтыя семінары і ўся пабыўка ў Беластоку былі вельмі каштоўнымі. Удзельнічалі ў іх прадстаўнікі камунальных устаноў не толькі з самога Гродна, але і раёна. Перапрацоўка бытавых адыходаў гэта адзін з дзевяці элементаў, якімі займаюцца нашы камунальныя ўстановы. Мы не маем такога вузкага падзелу на ўстановы ў гэтай галіне, як у вас. У вас у галіне адыходаў, як на звалцы смецця ў Грыневічах, па чарзе выконваецца збор, сарціроўка і перапрацоўка. У нас такая сістэма будзе толькі ўведзена. Добра было б, каб прадстаўнікі вашага самакіравання памаглі нам выканаць аналіз звязаны з планаванай у Гродне пабудовай фабрыкі па перапрацоўцы бытавых адыходаў. Вельмі цікавіць нас ваша тэхніка, арганізацыя працы, юрыдычныя рэгуліроўкі.

Вялікае зацікаўленне беларускіх гасцей выклікала абясшкоджванне азбесту, які ў Польшчы, асабліва з будынкаў і водаправоднай сеткі, мае знікнуць да 2032 года. Адзін з супрацоўнікаў „Аствы" паўжартам сказаў:

— Калісь трэба было прадаць адну карову, каб азбест пакласці на дах, цяпер трэба прадаць дзве, каб яго пазбыцца.

— У нас гэтай праблематыкай так шырока яшчэ не займаемся, — прызналася „Ніве" консул Наталля Міськевіч.

Нейкім чынам пры нагодзе заявіла, што калі будзе такая воля з польскага боку, у Гродне можна перапрацоўваць польскую пластмасу, а гродзенскія фірмы маглі б у Польшчы купляць паперу:

— Ёсць канкрэтная тэматыка, над якой можам разважаць у рамках супрацоўніцтва.

Дырэктар фірмы „Аства", а заадно старшыня Канвента Падляшскага клуба бізнесу Станіслаў Лунеўскі сказаў:

— Наша фірма падтрымлівае кантакты з адпаведнымі ўстановамі ў Гродне і Гродзенскай вобласці. Павінны яны яшчэ, аднак, узмоцніцца. Нас, прадпрымальнікаў, палітыка не цікавіць. Хочам абменьвацца вопытам, а нават засноўваць супольныя прадпрыемствы. Спадзяемся, што інструменты нашага супрацоўніцтва будуць паладжаны. З'яўляемся суседзямі і ніякай дыскрымінацыі ў галіне гаспадаркі быць не можа.

Дырэктар Лунеўскі пры нагодзе пахваліўся, што з'яўляецца спонсарам беластоцкіх валейбалістак, у ліку якіх змагаюцца тры спартсменкі з Беларусі.

Адзін з гасцей, віцэ-мэр горада Смаргонь Віктар Легін, пры развітальным келіху шампанскага ў сядзібе БКБ (палац Гасбаха) так падагуліў візіт у Беластоку:

— Шмат дасягненняў, якія мы тут бачылі ў галіне гаспадаркі бытавымі адыходамі, у нас яшчэ няма. Усіх нас уразіла звалка смецця ў Грыневічах і тэхніка фірмы „Аства". Мы хацелі б ісці следам гэтай тэхнікі і тэхналогіі.

Падарунак

Аб тым, што падарожжа адукуе, не трэба два разы паўтараць. Пакарыстаюся сваім прыкладам. Апошнім часам многа падарожнічаў я па Беларусі, наладзіў кантакты ў Раённым выканаўчым камітэце ў Камянцы і пазнаёміўся там з цудоўным чалавекам — старшынёй Савета дэпутатаў Нінай Данілаўнай Стасюк. На яе рукі перадаў я ў раённую бібліятэку больш дзесяці беларускіх кніжак, выдадзеных Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва". А мая знаёмая падарыла мне некалькі рэспубліканскіх часопісаў і каляровы экземпляр раённай газеты „Навіны Камянеччыны", прымеркаваны да Дня беларускай пісьменнасці, які два гады таму адзначаўся ў Камянцы як мерапрыемства рэспубліканскага рангу.

Камянецкі райвыканкам падтрымлівае кантакты з Гайнаўскім старостам. Плёнам гэтага супрацоўніцтва з'яўляецца часопіс „Па-суседску", які ад двух гадоў выдае Беларускі самаўрадавы форум у Гайнаўцы ў рамках праекта „Sąsiedzie, opowiem Ci o sobie". Дзесяць такіх экземпляраў атрымаў я ад Тамары Лаўрэнчук з Высокага. Каштоўны гэта падарунак, так як і кніжка „Забытых таямніцаў чар". Прызнаюся шчыра, што хоць і жыву непадалёк Гайнаўкі, але дагэтуль не ўдалося мне пазнаёміцца з гэтымі выданнямі. На ўвагу заслугоўвае факт, што допісы ў часопісе друкуюцца на беларускай і польскай мовах. Хоць выдаўцы канстатуюць, што гэта культурны часопіс жыхароў Белавежскай пушчы, але, па-мойму, яго змест зацікавіў бы шматлікіх чытачоў і сімпатыкаў „Нівы". Таму прапаную гайнаўскаму БСФ час ад часу даваць у „Ніве" інфармацыю аб тым калі выдаецца і дзе можна атрымаць згаданы часопіс ды праанансаваць цікавейшыя публікацыі.

Уладзімір СІДАРУК

Што далей?

На пачатку лістапада г.г. пачуў я ў тэлебачані, што з пачаткам 2008 года будзе ўвольненая цана на электраэнергію і яе кошт павысіцца на 10-15% за кілават. Што гэта абазначае, няцяжка дадумацца. Усе цэны пойдуць угару. Вядома, што ўсе прадпрыемствы, якія займаюцца вытворчасцю харчовых прадуктаў, паўсюдна карыстаюцца электраэнергіяй і калі яны пачнуць даражэй плаціць за электраэнергію, дык павысяць цэны сваіх вырабаў. Ужо цяпер пенсіянерам цяжка звесці канцы з канцамі, многія жывуць ніжэй пражытачнага мінімуму. А пасля павышэння цэн будзе так, што хоць ты жывым лезь у зямлю. Старыя ж людзі не выйдуць на вуліцу страйкаваць, каб павысілі ім мізэрныя пенсіі. А таго, што яны ў маладосці адбудоўвалі нашу дзяржаву з пасляваенных папялішчаў і сваёй руплівай працай спрычыняліся да яе росквіту, цяперашняя ўлада не бярэ пад увагу. А нам, пенсіянерам, вельмі хацелася б, каб восень свайго жыцця правесці годна і спакойна.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

З цыкла:

Размовы аб... літаратуры

Сустрэча з **Эдвардам Рэдлінскім**

дня 28.11.2007 г., гадз. 17.00
Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка"
вул. Т. Саланевіч, 2, Гайнаўка

ЗАПРАШАЕМ

зорка
для дзяцей і моладзі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Вавёрачкі з Рыгі

У сталіцы Латвіі — у цудоўным горадзе Рыга, працуе беларуская школа. Хоць „Зорку" ведаюць там шмат гадоў, я першы раз пабывала ў іх школе. У пачатку я заблудзілася. У тамашняй школе добра гуляць у хованкі. Замест аднаго, як у нас, калідора ў іх шмат лабірынтаў, пераходаў. (Раней там працаваў дзіцячы садок).

— Падкажыце мне дарогу ў настаўніцкі пакой, — прашу хлопцаў, якія гуляюць на адным з калідораў. Якраз перапынак.

— А вы з Беларусі будзеце? — цікавяцца.

— Не, з Польшчы.

— Як цікава! У вас таксама ведаюць беларускую мову?

Апавядаю ira нашых дзяўчат-шасцікласніц з Беластока. Самы гаваркі хлапец ставіць мне пытанне:

— А можа вы будзеце нашай новай настаўніцай?

— Ну...

Смяемся і дамаўляемся сустрэцца ўжо на ўроку. Цікавая справа. Спачатку хлопцы размаўлялі між сабой па-руску, але калі я загаварыла па-беларуску, яны адразу пачалі размаўляць на чысценькай беларушчыне. Справа ў тым, што многія прадметы ў Рызе выкладаюцца на беларускай мове.

З „Вавёрачкай" дырэктар школы Анна Іванэ (першая злева) і Наталля Дзервук

Пасля я пазнаёмілася з музычным гуртом „Вавёрачкі". Якраз адбываліся рэпетыцыі. Дзяўчаты спявалі пад акампанемент спадарыні Наталлі, якая іграла на раялі.

— А хто прыдумаў вам імя? — пытаю сімпатычных „Вавёрачак".

— Мы самі, — кажуць дзяўчаты. — Так называлася наша першая песня. „Вавёрачкі" існуюць з 1997 года — значыць ім дзесяць гадоў! У гурце 16 асоб. Апякуецца імі згаданая ўжо музыкант Наталля Дзервук. Гурт гэта гонар і аздоба школы. Для каго спяваюць беларускія песні? Хто іхняя публіка? У першую чаргу спяваюць для сяброў, сваіх настаўнікаў, бацькоў. Часта выступаюць на мерапрыемствах беларускіх арганізацый. І на латышскай сцэне — вядома, як маладыя прадстаўнікі беларускай дыяспары. У школе можна пабачыць іхнія граматы і атэстат. На канец „Вавёрачкі" праспявалі мне адну са сваіх песень ira... зоркі.

Тэкст і фота: zorka@niva.iig.pl

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

Песенька

Назбіраю лісцяў я
У двары,
Што зляцелі з клёніка
Без пары.
Пакладу ў кніту іх
Між лістоў.
Хай ляжаць, аціхлыя,
Каля слоў.
Хай гавораць-шэпчуцца
Аб вясне.
Хай складаюць песеньку
Для мяне.

Вавёрчыны пацеркі

Жыла-была ў лесе прыгажуня Вавёрка. Надта любіла яна ўборы. Цэлае лета штукавала з кветак прыгожыя бранзалеты. Але лета мінула, і кветкі — памерлі. Адна Гарабінка зіхацела чырвонымі гронкамі між голых галінаў. Нанізала Вавёрка пунцовыя ягадкі на гнуткую сухую травінку і атрымаліся прыгожыя пацеркі. Толькі на ноч здымала іх Вавёрка і вешала на сучок ля свайго дупла.

А птушкі тым часам адляталі ў вырай. Чародка Шпакоў прызямлілася, каб пераначаваць, на палянцы, якраз поруч з Вавёрчыным жытлом. Раненька прачнуліся, падмацаваліся ягадкамі-пацеркамі. А тут і Вавёрка са свайго дупла выглянула. Спахмурнела, замітусілася: „Дзе ж мае пацеркі?" Разгубленыя Шпачкі зразумелі: яны паласаваліся не проста гарабінавымі ягадамі. Важак чародкі прамовіў: „Прабач нам, Вавёрачка. Гэта мы з'елі твае пацеркі. Пакрыўдзіць цябе не хацелі. Дачакайся, пакуль мы вернемся вясною. Сваю правіну — загладзім".

Доўга цягнулася халодная зіма. Але ўсяму надыходзіць канец. Вясновае сонейка сагрэла зямельку, пацяклі ручаінкі, выглянулі пралескі. Чародка Шпачкоў прызямлілася на той жа палянцы. Першым Важак, а за ім кожны Шпачок падляталі да Вавёрчынага дупла і клалі туды па адной маціцовай ракавінцы. Панізала іх Вавёрка — атрымаліся цудоўныя каралі. З імі Вавёрачка-прыгажуня не развітвалася ніколі.

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

ГІСТОРЫЯ ПРА ДЗЯЎЧЫНКУ З САБАКАМ

Гэта быў апошні дзень восені. Апала ўжо лісце, знерухомелі дрэвы і зніклі паўсюль нават самыя позніе кветкі. Толькі дзяўчынка з хлопчыкам ішла апусцелым паркам і было ёй чамусьці сумна. Штосьці крыху трывожыла, нечага вельмі хацелася, а чаго — невядома. І хлопчык маўчаў, нібы забыў усе тыя самыя словы. Словы, словы... Яны — як кветкі, якіх так не хапае ў апошні восеньскі дзень. Дык вось чаго бракавала дзяўчынцы!..

— Хачу ружу, — вымавіла яна. — Не! Не проста ружу — я хачу найпрыгажэйшую ружу!

— Дзе ж я вазьму табе? — здзівіўся хлапчук.

— Дзе хочаш. Хоць з-пад зямлі.

Хлопчык спыніўся і ўважліва паглядзеў на яе. Так уважліва, што ягоныя вочы раптам ператварыліся ў сабачыя і заплакалі. Проста заплакалі, як плачуць увосень звычайныя сабачыя вочы. А потым — ужо звычайныя сабачыя лапы — рылі, ператрасалі ў парку зямлю, варушылі апалае лісце, даставалі і кідалі шмат рознага, лішняга..., толькі не кветку, толькі пакуль не кветку.

І раптам — сабака знік. А калі зноў з'явіўся — трымаў у зубах пераліўную зорку, аскепачак сэрца — найпрыгажэйшую ружу.

Тая ружа не вяне дасюль. І дасюль у восеньскім парку гуляе дзяўчынка, побач з якою — крыху паранены і вечна маўклівы сабака. З вачыма, поўнымі слёз.

Ваш Дзядзечка Сід

24 кастрычніка 2007 г., Кобрын

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Ганка

Мая сяброўка Ганка вельмі неадназначная. Заўсёды, калі нехта ўголас назаве яе імя, людзі раптоўна пачынаюць нас слухаць. Ганка — старшыня школьнага самаўрада. Яна вельмі адкрытая, у яе арыгінальныя думкі. Яе шчырасць часта выклікае шок. У нашай гімназіі адна настаўніца падала прапанову, каб кожны клас з нагоды ўсялякіх святаў прыдумваў цікавы інтэр'ер. Мой клас, як адзіны, не аздобіў залы на Свята незалежнасці. Мы падумалі, што такія рэчы падыходзяць для вучняў пачатковай школы. Аднак не ўсе ў школе збунтаваліся. Трэці „ц" клас прынёс старыя высушаныя дрэвы, наклеіў на сцяну многа сцягоў, пад дошкай змайстраваў магілу невядомаму жаўнеру і яшчэ увесь клас засыпаў лістоўем.

У сувязі з функцыяй, Ганка разам са спадарыняй Лучынскай мелі прыемнасць хадзіць па класах і ацаняць дэкарацыі. Майму класу на 10 балаў паставілі 2 (хаця ў нас ніхто не рушыў пальцам), а III „ц", той, які напрацаваўся — атрымаў 1 бал!

— Ці так можна? — стала папракаць Ганку Лучынская, — гэта ж найпрыгажэйшая зала.

— Я так не думаю, — не пагадзілася Ганка, — ад гэтай прыгажосці мне млосна і хочацца ў прыбіральню.

Пасля здарэння вучні яшчэ больш пачалі цікавіцца Ганкай. Злосныя дзяўчаты з III „ц" класа пісалі на сайце grono.net, якая яна грубая і несправядлівая. Большасць, вядома, думала інакш. Некаторыя вельмі крытычна напісалі пра задуму і эфект III „ц".

Ганка асацыюецца з „Басовішчам". Яна там кожны год, і яе ўсе пазнаюць як заслужаную ветэранку. Калі мы на горадзе сустрэнем некага ў кашульцы з фірменным знакам гэтага фестывалю, Ганка голасна крычыць: „Басовішча"!!! пога!!! „Жыве Беларусь!" Некаторыя асобы пачынаюць танчыць пога. Мы таксама — бо хочам хоць крышачку павесяліць жыхароў нашага сумнага горада.

truskawka9922@tlen.pl
lolcia05@tlen.pl

Музыка з кайфам

У палацах гісторыі... казка пра гурт „Палац"

Казак я пісаць, на жаль, не ўмею, распавядаць таксама не, але затое прачытаць або праспяваць — з ахвотай. Не толькі мне здаецца, што гэта прыемнасць. Помніце добра, што пачыналі мы гэты цыкл з „Калыханак" Змітра Вайцюшкевіча, цяпер зноўку вяртаемся да дзіцячай тэмы, бо гэты куток не толькі для моладзі, але і для дзяцей. Моладзі шчыра дзякую за лісты, напэўна пакарыстаюся вашымі прапановамі і ў будучыні вернемся да забытых некаторымі гісторый пра беларускія гурты Падляшша. Ці кажуць вам нешта назвы „Вядро" ці „Кардон"? Калі не, неўзабаве ўсё будзе вядома. А цяпер падаемся ў зачараваныя залы „Палаца"...

Паверыце або і не, але „Палац" свае музычныя казкі распавядае ўжо пятнаццаць гадоў. За гэты час удалося ім запісаць шэсць альбомаў, але гэта не самае цікавае. Самае галоўнае гэта адметнасць гурту, яго характэрнасць ды энергетыка. У Беларусі ўвогуле вялікай папулярнасцю карыстаецца найбольшы і самы глыбокі калодзеж інспірацыі, аб якім можна нават сказаць, што гэта бяздонная студня. Маю тут на думцы беларускі фальклор. Карыстаецца ім мноства гуртоў, успомню хаця б такія як „Kriwi", „Guda" ці „Ur'ia", якія перапрацоўваюць, аранжыруюць і складаюць толькі сабе характэрную музыку. Таксама і „Палац" ездзіць на этнаграфічныя экспедыцыі, збірае песні, расказы, з якіх можна даведацца пра значэнне розных з'яў. Так, для прыкладу, было з песняй „Прыляцела ластаўка". У час даследаванняў аказалася, што ластаўка мае вялікае значэнне ў хрысціянскай і язычніцкай культурах. Таму менавіта яны вырашылі стварыць песню пра ластаўку. Бывае, што паўстаюць песні на ўзор фальклорных твораў, так як гэта здарылася гурту „RIMA". У багатай творчасці гурту „Палац" можна знайсці таксама аўтарскія творы. Самае цікавае, аднак, што музыкі не баяцца зменаў у сучаснай музыцы. Хаця перш за ўсё займаюцца фолькам, то трэба сказаць, што яны вядомыя як тыя, хто фальклор спалучае з поп-музыкай. Думаю, што спакойна называць іх можна авангардыстамі.

А адкуль ідэя казак, з якой я пачала? Ну вось, якраз лідэр гурту Алег Хаменка запісвае калекцыю дыскаў з казкамі для дзяцей (у будучыні магчыма з'явяцца таксама і байкі для дарослых). Як кажа сам Хаменка, нават этнографы сцвярджаюць вялікую вартасць беларускага фальклору, у тым ліку і цікавых, мудрых казак. Цяпер запісваецца трэці альбом, а будзе іх ажно дзесяць. На кожным дыску апрача чытання ёсць і спецыяльна падрыхтаваная для гэтага праекта музыка. Я сама з нецярплівасцю чакаю і хаця, на жаль, я ўжо не дзіця, то з ахвотай паслухаю казак.

i_basovka@02.pl

Вершы Віктара Шведа

Нараканні

Паважна размаўляюць
Матуля з дачкою.
Дзяўчына наракае:
— Дом для мяне турмою.

А маці няспынна
Наракае іначай:
— Дом замужняй жанчыне
Заўжды лагерам працы.

Не слухаць, толькі іграць!

— Якое кіруе ліха
У музычную школу сынка?
На грош не мае ён слыху,
Не мае чаго тут шукаць.

— Навошта тут добрае вуха,
Навошта сыночка пугаць?
У школе не мусіць ён слухаць,
Павінен тут толькі іграць!

Польска-беларуская крыжаванка № 47



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 43: Ігрок, канава, фон, вагон, шаша, акр, галава, малако, Ікар, крок, воск. Грош, мір, нага, сок, шалік, кавалак, на, Ака, дагавор, вока, жанр, сук.

Узнагароды, **фламастэры (zakreślacze)**, выйгралі: **Карына Марта Гіншт, Кася Капытка, Ева Каролька, Юстына Анішчук** з Чыжоў, **Уля Беразавец** з Нарвы, **Сандра Івацік, Рахэля Паўлоўская** з Гайнаўкі. Віншуем!

Беларуская асвета ў Еўрасаюзе(3)

Ганна КАНДРАЦЮК

Высокі ўзровень навучання англійскай мовы і поспехі ў экалагічных праектах чамусьці не ўплываюць на цікавасць да роднай мовы. У мяне склалася ўражанне, што школа патраціла курс на незалежнасць і адметнасць у літоўскім краявідзе. Вось узяць хоць бы стэнды і інфармацыю на калідорах і ў прадметных залах. Няма тут паслядоўнасці ў прымяненні двухмоўя. Інфармацыя найчасцей падаецца толькі па-літоўску, часам па-беларуску, рэдка на дзвюх мовах, адначасова. Прытым на калідорах і ў настаўніцкім пакоі гучыць руская мова.

Апошняя справа — праблема асіміляцыі, якая ідзе з Беларусі. Прытым здзівіў мяне славянафільскі ўхіл (дарэчы, ідэнтычны сустрэла я ў Прыднястроўі). На вестку, што я з Беластока, ахоўнік будынка, які дапамагаў мне не заблудзіцца ў пакручастых калідорах-лабірынтах, пахваліў нашу праваслаўную грамаду:

— У вас такая прыгожая, вялікая царква, малайцы!

Вестка пра адзінаццаць беластоцкіх цэркваў (і дзве ў пабудове) ашаламіла сімпатычнага ахоўніка. Мяне, у сваю чаргу, уразіў нетутэйшы спосаб думання. У Вільні, як нідзе, беларуская грамада прыналежыла разнавідным канфесіям. Побач праваслаўных былі тут католікі, пратэстанты, уніяты, мусульмане. У славутай Віленскай беларускай гімназіі ўрокі рэлігіі выкладаліся для праваслаўных, католікаў, пратэстантаў. У Базыльянскіх мурах, побач гімназіі, існаваў нават сіраціпец, якім апекаваўся ксёндз Адам Станкевіч. Словам, справа рэлігійнай прыналежнасці не была вырашальнай!

— Ці ёсць сярод настаўнікаў свядомыя беларусы? — пытаю ў Леакадзіі Мілаш. У адказ называе яна прозвішчы настаўніка хіміі Яраслава Станкевіча ды настаўніка гісторыі Сяргея Вітушкі. Абодва, на жаль, ужо не працуюць. Першы адышоў па прычыне пенсійнага ўзросту, другі — з-за хваробы.

— Нашай школе на сённяшні дзень не хапае такіх энтузіястаў, — кажа спадарыня Леакадзія.

Гэты недахоп спрычыняецца да недарэчнасцей, якія маюць месца ў школе. Віленскія беларусы наракаюць, што ў Дзень Волі — 25 сакавіка — у беларускай школе (якую яны самі заснавалі) нельга павесіць бел-чырвона-белы сцяг!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Ля ўвахода ад вуліцы школу ўпрыгожвае стэнд з „купалінкай"

* * *

Нацыянальна-адукацыйны поспех Віленскай беларускай гімназіі ў большасці залежаў ад кадраў. Тут працавалі (часам у цяжкіх умовах і за мізэрныя сродкі) найлепшыя сілы Беларусі. Сярод настаўнікаў былі згаданы ўжо Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Барыс Кіт ці ксёндз Адам Станкевіч... Выпускнікі віленскай гімназіі прадаўжалі беларускую ідэю ў БССР, на Беласточчыне, у эміграцыі.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Уваход ад панадворка здобіць літоўскі сцяг

— Якім чынам Вы набіралі кадры ў сваю школу? — пытаю Леакадзію Мілаш. У віленскай беларускай школе імя Францішка Скарыны працуе больш за трыццаць настаўнікаў. Словам — прыстойная грамада, якая магла б заснаваць не адну суполку.

— Гэта былі колы беларускай інтэлігенцыі. Вось настаўніцы беларускай мовы Алена Базюк і Дзіяна Стахновіч у Вільні апынуліся па сямейных прычынах (выйшлі замуж). Раней яны закончылі беларусістыку на Гродзенскім універсітэце. Ёсць настаўніца, бацька якой працаваў дырэктарам беларускай школы на Градаўшчыне (памежжа Літвы і Беларусі). Бацька нашай дырэктаркі Галіны Сілавай таксама працаваў дырэктарам школы.

Сама Леакадзія Мілаш выкладала ў рускай школе. Трапіла сюды, дзякуючы літоўскаму беларусафілу Вальдзісу Панайцісу.

— Яшчэ ў савецкі час я многа выпісвала беларускіх кніжак і газет. Гэта ў мяне ідзе ад сям'і, ад бацькоў. У нас была вялікая бібліятэка, усе ў сям'і імі цікавіліся і чыталі. Я памятаю, што ўжо з пятага класа камплектавала бібліятэку. Вальдзіс Панайціс пачаў шукаць тых, хто выпісвае беларускую прэсу, такім спосабам ён выйшаў на мяне. Так што назбіраць кадры не было ніякіх праблем. Тым больш што якраз развальваліся рускія школы. Дарэчы, тут па сямейных прычынах апынуўся і кіраўнік „Талакі" — згаданы ўжо настаўнік гісторыі. Зараз у школе працуюць нашы выпускнікі. Гэта выкладчыкі англійскай мовы, выпускнікі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

* * *

У Вільню ехала я з інфармацыяй, што быццам усе выпускнікі беларускай школы паступаюць у ВНУ ў Рэспубліцы Беларусь.

— Такая з'ява выступала ў пачатку 90-х, — кажуць у школе.

Зараз няма такога зацікаўлення. У мінулым годзе, напрыклад, паступіў адзін выпускнік (ён меў беларускае грамадзянства). Што спрычынілася да такога заняпаду?

— Справа ў эканоміі, — Леакадзія Мілаш прыводзіць у прыклад досвед сяброўкі, якая нядаўна ездзіла на вяселле да сына ў Мінск. Усе фармальнасці звязаныя з падарожжам (віза, страхоўка, прапіска, непрадбачаныя кошты на мяжы) каштавалі больш, чым падарак маладым. Студэнт апрача коштаў падарожжа вымушаны заплаціць яшчэ за харчы і жытло. Апошні выдатак большы, чым у Літве. Зараз больш карысна паступіць у прыватную вышэйшую ўстанову ў Літве, чым у дзяржаўную вучэльню ў РБ. Іншая справа — некарысныя палітычныя змены. Чалавек, які прыязджае з Вільні, адчувае псіхічны дыскамфорт. Ідзе пра адкрытасць у нацыянальным пытанні. У Беларусі забаранілі выкладаць Быкава, Геніюш, Арсенневу, Гілевіча...

Пытаю, якія спецыяльнасці выбіралі ў Мінску іх выхаванцы. Спачатку паступала туды нават па 20 чалавек у год.

Самым вялікім зацікаўленнем карысталіся прэстыжныя вучэльні, такія як Юрыдычны факультэт БДУ, Медыцынская акадэмія, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт, Сахараўскі экалагічны універсітэт. Віленскім беларусам было лягчэй паступіць, чым мінчукам ці палачанам. Дадатковыя балы давалі ім за вучобу ў беларускай школе. Дарэчы, такімі прывілеямі карысталіся і выпускнікі нашых белліцэяў. Зараз і ў нас няма ахвотных вучыцца ў Беларусі...

(працяг будзе)

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Двухмоўную дошку школы сустрэнем толькі ў сярэдзіне будынка

ПАНСУРАЖСКІ ПРАЕКТ

Размова з бурмістрам Суража, што ў Беластоцкім павеце, Славамірам ГАЛІЦКІМ.

— У днях 11-14 кастрычніка Вы пабывалі з візітам у Суражы Віцебскага раёна. З чаго ўзялася ідэя такіх кантактаў і які быў іх пачатак?

— Калі пяць гадоў таму заснаваў я Таварыства прыяцеляў Суража, знайшоў я на карце Еўропы пяць такіх мясцовасцей і стаў меркаваць ці яднае іх нешта больш чым сама назва. У мяне вялікі сантымент да Усходу. Маё прозвішча Галіцкі паказвае магчымае паходжанне продкаў з Галіцкай Русі. Прыглядаючыся гістарычным картам Кіеўскай Русі я заўважыў, што тыя мясцовасці былі на яе рубяжах, у тым ліку і наш — падляшскі. І зацікавіла мяне назва — адкуль яна ўзялася. Гэтая назва мае няпольскія карані, затое ў старарускай мове прыметнік *ръжи* абазначае моц, магутнасць. Мы выбралі Сураж у Віцебскім раёне, бо ён парытэтны з нашым па колькасці насельніцтва: там пражывае каля 1,1 тысячы жыхароў, у нас няцэлая тысяча, ёсць у нас сходныя публічныя ўстановы, распалажэнне на вялікіх рэках — тут Нарва, там Дзвіна, тут і там сярэдневяковыя гарадзішчы, ну і суседства Падляшскага ваяводства з Беларуссю. Нечаканасцю для мяне было таксама супастаўленне гербаў нашых гарадоў, яны са сходным сюжэтам — тры вежы на абодвух — значыць, чарговы супольны элемент. Беларускі Сураж атрымаў гарадское права сто гадоў пазней за наш.

Яшчэ хачу сказаць, адкуль усе гэтыя Суражы ўзяліся. Маё меркаванне такое: мясцовасць Судак на Крыме раней мела найменне Сурож, а раней, на турэцкай ці хазарскай мове называлася Суг-дэй. Спярша была гэта візантыйская калонія. Польскі археолаг Аляксандр Камінскі сцвярджае, што наш падляшскі Сураж заснавалі ганімыя хазарамі і татарамі ўцекачы з Крыма. Магчыма, што яны заснавалі ўсе гэтыя Суражы. Іншая мая гіпотэза такая, што былі гэта крэпасці Кіеўскай Русі. Дарэчы, гэтую гісторыю будзем яшчэ ўсебакова высвятляць.

— У мяне іншае меркаванне наконт этымалогіі назвы Сураж. Паколькі ўсе Суражы пасаджаны на вялікіх рэках: беларускі на Дзвіне, расійскі на Іпуці, украінскі на Віліі, наш на Нарве, дзе магла выступаць балотная руда. Су- — побач, побач руды — ржавай ржы. Словам суржык, быццам памяншэннем ад слова сураж, называлі даўней род рыжа-карычневай, рудой фарбы...

— Чарговым чыннікам, які нас наблізіў, было братэрства душ — беларусы прынялі нас пераўзышоўшы ўсе нашы спадзяванні. У віцебскай газеце „Жыццё Прыдзвіння" інфармацыя пра наш візіт была змешчана на перадавым месцы, прэзентавалі нам аднаўленне мясцовасцей у рамках адмысловай прэзідэнцкай праграмы; усюды віталі нас хлебам-соллю. Цяпер хачу ім аддзячыць і запрасіць дэлегацыю ад іх да нас. Нашай задуманай мэтай выезду ў той Сураж была разведка, такая тапаграфічная. Яны ж уразілі нас, нарыхтаваўшы ўжо змест дамовы, на — падкрэсліваю — беларускай мове. Я тую дамову за вечар прачытаў і мне ўсё было зразумелае.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Славамір Галіцкі

Я тады дапусціў адзін промах, бо мне нельга, без дазволу Гарадской рады, заключаць міжнародныя пагадненні, але паколькі беларускі бок на такую дамову вельмі разлічваў, дык мы яе падпісалі. І ўжо тут, на сесіі Гарадской рады, удалося мне пераканаць нашых радных, што варта такое пагадненне заключыць. Лёгка не было, трэба было крыху патлумачыцца, чаму з усходнім, а не з заходнім партнёрам, які нам будзе эканамічны выйгрыш ад гэтага супрацоўніцтва. Я тлумачыў, што справа не ў эканоміцы, але ў пошуках супольных каранёў, супольнай гісторыі і шматлікіх — невядомых яшчэ — паралелей з нашай гісторыі. Апрача гэтага мы, палякі, можам ставіць вялікую задачу перадачы нашага і нават еўрапейскага самаўрадавага вопыту. Прызнаюся, што з вялікімі пакутамі гэтая пастанова была прынята большасцю дзвюх трацін галасоў. Але ўсё ўжо пастаўлена на свае месцы, звярнуўся я ўжо ў Консульства Рэчы Паспалітай у Мінску і ў Віцебскі выканкам за садзеяннем у нашых кантактах. На самым пачатку вялікую дапамогу аказаў нам Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхал Аляксейчык, які цесна звязаны з Віцебскай зямлёй — ён з вялікай радасцю ўспрыняў нашу ініцыятыву.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Гісторыю Суража відаць на вуліцах

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Гарадзішча мяжуе з касцёлам

— Зараз у Вас кантакт толькі з віцебскім Суражам? Бо ж ёсць іншыя, напрыклад, у Іўеўскім раёне...

— Вяртаючыся з Віцебшчыны наведалі мы і гэтую мясцовасць. Гэта вёска з чвэрцьтысячным насельніцтвам, аднак не давялося там затрымацца, бо мы спяшаліся ўжо ў Польшчу. Найбольшы з Суражаў у Бранскай вобласці, дзе звыш дзесяці тысяч насельніцтва. Паколькі я не магу непасрэдна заключаць кантакты з кожным з гэтых Суражаў, буду прасіць нашых беларускіх гасцей, каб яны, маючы бліжэй, завязалі супрацоўніцтва з расійскім Суражам, тады з гэтага атрымаецца такое трохбаковае пагадненне. Яно нам патрэбнае дзеля хадайніцтва за еўрасаюзнымі сродкамі з фонду INTERREG, дзе неабходная наяўнасць трох партнёраў, у тым ліку расійскага і беларускага. У час найбліжэйшай сустрэчы паспрабуем выпрацаваць фармулёўку праекта наконт культурнага і турыстычнага абмену ўжо ў будучым годзе ў рамках нашых двух найбольшых мерапрыемстваў. У нас ад сямі гадоў у канцы чэрвеня адбываецца Сярэдневяковы фэст, дзе штогод прадстаўляем іншую гістарычную эпоху; сёлета быў гэта перыяд Рымскай імперыі. Госці з Беларусі прыехалі б да нас у канцы чэрвеня, а мы да іх у палове ліпеня на Славянскі базар у Віцебск. Маем што паказаць — у нас працуе дзіцячы ансамбль даўняй, сярэдневяковай музыкі, маем актыўнае Брацтва славянскіх ваяроў — з якімі маглі б туды паехаць.

— Праект, пра які мы тут гаворым, мае быць рэтраспекцыяй у мінулае. Мяне тут уразіла жывая гісторыя на вуліцах, дзе паказаны не толькі сённяшнія іх назвы, але і гістарычныя; такога я не бачыў у іншых мясцовасцях. Ну і сярэдневяковае паселішча ў вас, зараз побач Нарвы. Тут, у Суражы, ёсць хіба асабліва спрыяльны грунт для сваёй гісторыі?

— Нам трэба падкрэсліваць свае вартасці, сваю тоеснасць. Вартаснае тое, што выдзяляе нас на фоне іншых. Шматкультурнасць прыцягвае таксама ўвагу наведвальнікаў. У Суражы, дзе калісь былі тры царквы, не астаўся след ад праваслаўя, за выключэннем XIX-вечных могілак за горадам у напрамку Завык. Тры гады таму я, як старшыня Таварыства прыяцеляў Суража, у паразуменні з настаяцелем Кажанскага прыхода наладзіў

працяг ☞10

9 ☞працяг з двума праваслаўнымі раднымі грамадскую акцыю расчысткі тых могілак. Сёлета мы добраўпарадкавалі кіркут. І да канца лістапада паставім дванаццаць інфармацыйных табліц на польскай і англійскай мовах на г.зв. культурнай дарожцы, якая праляжа ад кіркута да праваслаўных і каталіцкіх могілак. Будуць там апісаны нашы гістарычныя аб'екты, у тым ліку Рускі рынак — трохвугольны цэнтр правабярэжнага Суража — з захаваным здымкам царквы.

Прызнаюся, што мясцовае грамадства адмяжоўваецца ад гэтых каранёў. Вельмі складана ім гэта растлумачыць. Каля дзве траціны прозвішчаў у тэлефонным даведніку Суража маюць усходнеславянскае паходжанне. Пасля скасавання уніяцтва адбылася канверсія. Вядомыя вам, пэўна, і трагічныя падзеі перыяду Студзеньскага паўстання 1863 года, звязаныя з Канстанцінам Пракаповічам, можа яны яшчэ захоўваюцца ў памяці людзей, таму трэба дзейнічаць вельмі далікатна, каб не знеахвоціць да такіх ініцыятыў гэтае грамадства. Але хтось павінен ім гэтую гісторыю, гэтую праўду, пераказаць, бо яны жывуць у несвядомасці.

— ***Яшчэ спытаю пра рэканструяванае паселішча: на якой аснове яно прымае такі кшталт?***

— Гэта аўтарская копія, сучасны праект, які паўстаў пасля кансультацый з археолагамі і архітэктарамі.

— ***У Суражы ёсць раннесярэднявечнае гарадзішча. Зараз ёсць там пакладзеныя ўсходкі: ці прадбачваюцца там яшчэ нейкія дзеянні?***

— Паставім там адну са згаданых мною табліц. Аб'ект атрымае таксама начное асвятленне архітэктурнай формы. Захавальнік помнікаў даўніны не дазваляе рэканструяваць крэпасць, бо няма верагодных падстаў для гэтага, таму і наша паселішча будуем у іншым месцы, больш выгадным для наведвання. Сёлета былі высечаны чатырнаццаць растучых на скаце гарадзішча дрэў, якія засланялі аб'ект і разбуралі яго. Экалогія экалогіяй, але яна, бывае, канфліктуе з архітэктурай і гісторыяй. Забяспечваем таксама дзірваном скат ад абсядання.

— ***Ці ў віцебскім Суражы таксама так цікавяцца гіторыяй, ці інакш?***

— Гісторыяй не, але культура там на значна вышэйшым, чым у нас, узроўні, бо там ёсць тры культурныя ўстановы, дзе працуе звыш дзесятка асоб, калі ў нашым Гарадскім асяродку культуры толькі дзве. Ёсць там Дзіцячы цэнтр творчасці, дзе вялікая ўвага адводзіцца рукадзеллю. Было замала часу для сустрэч з гісторыкамі, але спадзяюся, што ў ходзе далейшых сустрэч зможам з імі наладзіць кантакт. Аднак ёсць чаму ў іх павучыцца, хаця б рукадзеллю, напрыклад, ганчарству. Мы, у нашым паселішчы, маем кузню, маем ганчарскую майстэрню, маем кросны, хочам паставіць домніцу. Мы арганізуем мерапрыемствы гістарычнага характару, а яны — этнаграфічнага.

— ***Я з Інтэрнэта даведаўся, што дамова між Суражамі прадбачвае культурны, турыстычны і маладзёжны абмен. Пра культуру мы гаварылі, можа цяпер крыху пра іншыя дзялянкі.***

— Гэта будзем канкрэтызаваць у час візіту беларускіх гасцей у нас. Турызм я звязваю з культурным абменам. Хацелася б арганізаваць лодачныя паходы па Дзвіне з Суража ў Віцебск і тут праплыў праз Нарваўскі нацыянальны парк. Магчыма, што гэта дасць штуршок для большага турыстычнага размаху.

— ***Ці ўжо дапрацаваная праграма візіту ў Сураж беларускіх гасцей?***

— З чатырох дзён два дні зоймуць гасцям праезды, і на дзелавыя справы астаюцца два дні. У пятніцу, 30 лістапада, будзе афіцыйная сустрэча тут, у Гарадской управе. Будзе таксама наведванне Суража, мясцовых музеяў. Будзе наша культурная прэзентацыя. І размовы наконт праекта. Суботу хочам правесці больш свабодна, можа ўдасца наладзіць экскурсію ў адну з суседніх мясцовасцей — Харошчу, Супрасль ці Тыкоцін. Магчыма, што падключым гасцей да нашай вялікай урачыстасці — адкрыцця спартыўнай залы ў Суражы, запланаванага на 30 лістапада. Хочам іх прыняць вельмі сардэчна, падзякаваць ім за незабыўныя ўражанні ад нашага візіту ў іх.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

ПАНСУРАЖСКІ ПРАЕКТ

Рэканструкцыя сярэдневяковага паселішча

http://8dzn.net

ВОСЬМЫДЗЕНЬ

Быў час, калі беларускія музыка і спевы для мноства людзей атаясамляліся з нечым фальклорным альбо з двума-трыма гуртамі, якія былі вядомыя ледзь не ад пачатку дзяцінства. Палітычныя і сацыяльныя змены канца мінулага стагоддзя адбіліся і на культурным жыцці беларускага народа — сёння гуртом, які спявае па-беларуску здзівіць цяжка, хоць тэндэнцыяй апошняга дзесяцігоддзя ёсць звужэнне кола выкарыстання беларускай мовы.

На старонках „Нівы" мы ўжо неаднаразова знаёміліся з калектывамі, што спяваюць па-беларуску ў розных музычных плынях. Сёння таксама віртуальна пазнаёмімся з такім гуртом, які носіць загадкавую назву „Восьмыдзень".

Калі зайсці ў Інтэрнэт і набраць на камп'ютэры адрас **http://8dzn.net**, то перад намі адкрыецца традыцыйнае для многіх рок-гуртоў чорнае выяўленне. На ім стваральнікі сайта і гурту з першай старонкі распавядаюць пра „Восьмыдзень": „Нейкі этнічнага накірунку гурт з Віцебска. Вызначэнне стылю даволі цяжкая і асабіста для нас не надта патрэбная справа... Адзінае вядома дакладна, бо нязменна — мова, якую вы чуеце ў нашых песеньках. Беларуская, з дамешкам старабеларускае, амаль забытая сягоння, але такая пявучая і чароўная мова маленькага народа. Нам хацелася б, каб людзі ведалі і памяталі, хто яны, не мкнуліся б да захаду ці ўсходу, бо сваё можна знайсці толькі побач. Наша мэта — паказаць, што народ наш не загінуў, што мы здольныя не на малыя справы, што ў нас таксама можа быць свой шлях, і, няхай няшмат яшчэ сілаў, нам за гэта ні перад кім і ніколі не павінна быць сорамна. А гурт «Восьмыдзень», калі дазволіце, будзе маленькай служкай у развіцці сучаснай і будучай беларускай культуры".

Як бачым, мэты і задачы перад сабой гурт ставіць вельмі высакародныя. Што ж тычыцца ўласна сайта, то тут пакуль адчуваецца нейкая недапрацаванасць. Так, на старонцы „Хто стварае", дзе распавядаецца аб удзельніках гурту, не падаецца ніякіх фотаздымкаў з імёнамі музыкаў. З таго першае знаёмства з калектывам становіцца няпоўным, хоць да агульнай фотагалерэі розных выступленняў „Восьмага дня" можна выйсці з кожнай старонкі.

Рубрыка „Аб гісторыі" змяшчае два невялікія тэксты пра тое, як утварыўся гурт і якія метамарфозы адбываліся з ягонай назвай. Згодна ўспамінам музыкаў, рускамоўная назва „Восьмой день" перайшла ў беларускую „Вось мой дзень", якая ў далейшым скарацілася ў цяперашняе вельмі арыгінальнае імя калектыву.

Калі вярнуцца да фотаздымкаў, то ўбачым, што хлопцы выступаюць у шатландскіх спадніцах. Гэта таксама ёсць вельмі неардынарным, бо не ведаю як вы, паважаныя чытачы, але я не ведаю такіх беларускамоўных гуртоў, якія б выступалі ў шатландскіх народных строях. Аб тым, як „Восьмыдзень" зрабіў гэтае адзенне сваёй адметнай рысай, распавядаецца ў „гістарычнай" рубрыцы.

Адным з недахопаў сайта ёсць тое, што, нягледзячы на нядаўняе з'яўленне, абнаўляецца ён не надта часта. Так, на старонцы „Пра канцэрты" да будучых выступленняў аднесены канцэрт амаль паўгадовай даўніны.

Ну, а каб праслухаць тое, што менавіта спяваюць „васьмідзёнцы", трэба зайсці ў рубрыку „Музыка ды відэа", дзе і месцяцца запісы іх песень.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Успліск пад дажджом

Нарэшце футбольная зборная Беларусі парадавала сваіх прыхільнікаў, колькасць якіх апошнім часам падала ці не ў арыфметычнай прагрэсіі, выніковай гульнёй і перамогай. У перадапошнім матчы адборавай кампаніі да чэмпіянату Еўропы нашы футбалісты з лікам 4:2 перамаглі ў Тыране гаспадароў поля — дружыну Албаніі. Матч не меў асаблівага турнірнага значэння, бо сапернікі разам са славенцамі аспрэчваюць толькі чацвёртую-шостую пазіцыю ў групе. Тым не менш выніковае месца будзе наўпрост уплываць на сеянне ў адпаведны „кошык" пры наступным лёсаванні краін. Сустрэчы з албанцамі папярэднічалі таксама некалькі цікавых акалічнасцей. Гульня па рашэнні УЕФА павінна была адбыцца пры пустых трыбунах, але ўрэшце еўрапейская федэрацыя выявіла літасць і дазволіла прысутнасць гледачоў. Матч меў куды большую актуальнасць для беларусаў, якія серыяй бляклых паразаў надзвычай апусцілі свой і маральны, і матэрыяльны рэйтынг. Балазе, трэнер Бернд Штанге, падобна на тое, скончыў свае дзіўныя эксперыменты і быў змушаны прыслухацца да дасведчаных галасоў. У зборную перад албанскім візітам было вернутае трыо праверaных байцоў — Аляксандр Кульчы, Віталь Кутузаў і Віталь Булыга правялі свой першы паядынак пад кіраўніцтвам нямецкага ландскнехта і выразна прадэманстравалі сваю патрэбнасць галоўнай камандзе краіны.

Пацвердзілася старая як футбольны свет ісціна — галы забіваюць тыя, хто больш-менш рэгулярна робіць гэта ў сваіх клубах. Зачын зрабіў Максім Рамашчанка, які выступае за маскоўскае „Тарпеда". І хоць албанцы, скарыстаўшыся дзіцячымі пазіцыйнымі памылкамі нашых абаронцаў, хутка адказалі двума трапнымі стрэламі, на перапынак каманды пайшлі роўнымі — вызначыўся Віталь Кутузаў, у якога прарэзаўся снайперскі апетыт яшчэ ў італьянскай „Пізе". А ў другім тайме беларусы завалодалі ініцыятывай і забілі ажно два разы. Той жа Кутузаў запісаў на свой рахунак 12-ы мяч за зборную, а пасля Рамашчанка зарабіў пенальці і сам яго рэалізаваў — на балансе рэкардсмена дружыны гэта 6-ы запар рэалізаваны пенальці за „нацыяналку" і 19-ы гол.

Парадаваў не столькі змест гульні, колькі самаадданасць нашых футбалістаў, якой даўно не даводзілася бачыць. Матч ад пачатку да канца праходзіў пад праліўным дажджом і на першы план выйшлі менавіта атлетычныя і валявыя якасці. У тэхнічным плане госці таксама даказалі сваю перавагу і толькі кепскае поле ўберагло албанцаў, якія часам атакавалі таксама востра, ад большай паразы.

Перад заключным турам, становішча ў нашай групе наступнае: 1) Румынія — 26 ачкоў; 2) Нідэрланды — 26; 3) Балгарыя — 22; 4) Албанія — 11; 5) Славенія — 11; 6) Беларусь — 10; 7) Люксембург — 3. У апошняй сустрэчы Беларусь прымае дома прадстаўнікоў краіны цюльпанаў, якія разам з румынамі ўжо вырашылі свае задачы.

Заўчасная развязка змагання за пуцёўкі на еўрачэмпіянат надышла і ў бальшыні іншых груп. Выхад у фінальную частку забяспечылі сабе Італія, Францыя, Харватыя, Грэцыя, Іспанія, Нямеччына, Чэхія, Польшча, Румынія, Нідэрланды, практычна Швецыя, адной нагой ужо стаяць там Партугалія і Турцыя. Плюс гаспадары — Швейцарыя і Аўстрыя. Апошняе месца павінна заняць Англія, якой дастаткова згуляць унічыю на сваім полі з харватамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гамонкі збоч дарогі

Міра ЛУКША

На ляўкоўскім хутары

— Ад ляўкоўскай дарогі ўбачыце той хутар, налева, — паказвае нам Мар'янна Рэент групку пабудоў збоч дарогі. Шукаем са Сцяпанам аднаго тутэйшага старажыла-спевака. Сцяпан Копа, як заўсёды на сваіх падарожжах слядамі роднай песні, узброены ў магнітафон, хоць той сёння якраз ледзь дыхае. Знойдзем дзедапеюна 1920 года нараджэння, пасля будзе нагода зноў яго наведаць.

На дварэ сярэдзіна лістапада, моцна сячэ вецер, імжыць колкі сняжок.

— Дзе жыве твой дзед Канстанцін Каролька? — выхінаецца з-за шыбы Сцяпан, убачыўшы хлапчаня, якое валачэ вялікі веласіпед, ідучы ад збудаванняў. Хлопчык узіраецца, мяркуе: «А, Костак Каролька, о, там!» Відаць, не ягоны гэта дзед, а хлопчык быў у гасцях у калегі. А той выходзіць з татам з шопкі, нясуць дзіўна спакойнага, пагоджанага са сваім лёсам аграмаднага гусака. Гэта ўнук і сын дзеда Кастуся, Янка. А з другога боку збудавання маладая жанчына цёпла ахутаная з двума малечамі ўпраўляецца з яшчэ большай гускай. Усё падворышча застаўлена безліччу розных гаспадарчых машын, некаторыя з якіх выглядаюць яшчэ на дапатопныя. Відаць, шкада выкідваць, у гаспадарцы ўсё можа прыдацца...

Фота Міры ЛУКШЫ

Надзея і Канстанцін Каролькі

Заходзім у хату. На цёплай ляжайцы ў кухні сядзяць дзед і баба, каля іх котка. На душы таксама цяплее. Сцяпан адразу бярэцца за справу. Якія нашы песні памятае дзед Кастусь? Пакуль дзядуля памаленьку адчыняе дзверы сваёй памяці, маладзейшая жонка, Надзея, на тую яго памяць махае рукамі:

— Няма, няма памяці, няма. Уцякла, — кажа. Бо вазьмі ды спамяні раптам словы песні.

— Гэта так, што не памятаеш таго, што сёння рабіў, а словы з песні помніш, — не здаецца бывалы Сцяпан, які не раз даставаў з памяці старажылаў старажытныя залежы.

— І таго шмат пазабываў! Гэта ўжо за глыбокія лета. Памяць уцякла!

— Я пра вас пачуў ад Мікіты Карпюка з Капітаншчыны, што вы ведаце шмат песень, — працягвае Сцяпан. — Яму ўжо дзевяноста пяць гадоў было дзесяць гадоў таму. Дзесь пад сотню ўмёр. Ён мне сказаў, што вы ведаеце. Я войту паказаў мае кніжкі, і войт пацвердзіў, што вы знаеце шмат песень...

— Не помню песень. Ды сцішок Кальцова помню. Харошы верш. З кніжкі.

— Ездзіў да Фёдара Хлябіча з Рыбакоў, — тлумачыць Надзея. — Той Хлябіч таксама вершыкі любіў. У „Ніву" шмат пісаў, вершыкі і не вершыкі. Косця прачытаў у „Ніве", што такі чалавек ёсць у Рыбаках. Паехаў да яго. І ад яго таксама трохі вершыкаў прывёз. Ды крышку большая памяць тады была. І той Хлябіч таксама ўжо памёр.

Тут дзед Косця не стрымаў і, успомніўшы доўгі філасофска-прыродаапісальны верш Кальцова, сказаў яго амаль без запінкі.

— Харошы верш, — і яго запісаў Сцяпан на сваім дыктафоне. — Ды мяне найбольш зацікавілі б святочныя песні, на вашай нараўчанскай гаворцы. Вось, паслухайце, як учора спявалі ў ляўкоўскай святліцы.

— Хораша спявалі. А я вам заспяваю „Пад акном чаромуха стаяла..."

І дзядуля гучна адспяваў песню, ад якой бабуля Надзя аж уздыхнула: „Вось, гады праляцелі, як тыя белыя пялёсткі чаромхі..." і дадала:

— Калі б хто пачаў, прыпомніў словы, то пайшло б. Вось, гэтыя цяперашнія пеўчыя, што ў Ляўкове, то ўсе песні знаюць.

— Кожны песню па-свойму спявае, нават калі яна такая самая. А, можа вясельныя помніце, можа, вясенння, юр'еўскія?..

— Ужэ тумба, ніц! — махае рукой Кастусёва жонка, а дзед усё прабуе дабрацца да сваёй памяці, і ўсміхаецца да яе, тае памяці. — Яшчэ на якой імпрэзе, калі хто пачне, напамяне, то зараз усю песню заспявае. Я на 12 лет малодшая ад яго, і сама не помню.

Фота Міры ЛУКШЫ

Янка Каролька гаспадарыць на сваім

— Песня, якую запамятаеш з дзяцінства, заўсёды ў памяці застанецца, — хоча падтрымаць крыху разгубленага дзядулю Сцяпан. І запісвае тую вядомую рускую песню пра белую чаромху за акном. А я з Надзеяй, пад чуйным вокам старое коткі, устрывожанай раптоўным наездам чужых людзей на ціхі дом яе гаспадароў, пачынаю гамонку пра суседскія справы. Надзея Каролька родам з блізкай да Бандароў Слабодкі. Вядома, хто ж не ведаў мае двюраднае прабабы Зосі Харкевіч, адной са старажылак Нараўчанскай гміны (дажыла яна 102 гадоў, перакаціўшы з XIX у XXI стагоддзе), ведае спадарыня Надзея ўсе розныя сувязі па акалічных вёсках. Ой, і ведалі яе мужа як вялікага майстра спеваў! І цяпер, як дзе якое вяселле трапіцца, то спявае як мала хто. Хай толькі хто завядзе песню — кожную дацягне да канца. Усе свойскія — беларускія, украінскія ды і рускія, што нашы людзі шмат прывезлі са свету, яшчэ з бежанства. І польскія таксама, калісьнейшыя. Вось, і пачаў дзед Кастусь даваенную песню пра каханне. А найбольш добра цягнецца яму з Нінкай барнацкай, Колевай жонкай, Надзінай браціхай. З Барнацкага Мосту. Брат памёр. Калі Сцяпан хоча, хай пад'едзе да барнацкай Нінкі, і разам з Косцем яму што хочаш наспяваюць.

Рады Кастусь і Надзя, няма што наракаць — сваіх дзяцей пяцёра пагадавалі, ужо і прадзеды яны, і сын тутака іхні, Янка, жыве, гаспадарыць, на іхніх 10 гектарах, і 50 гектараў з жончынага боку зямлі набраў, з Луплянкі, пасляпэгеэрнай. Усё машынамі робіць. Гусей тут гадуе, збожжа прадае. Працаваў крыху ў Беластоку, ды *жандовая* работа яму не адпавядала — захацеў на гаспадарцы быць. Дзетак чацвёра гадуе, трое ў Нараўку ў школу ходзіць, адно ў садок... Адась, Кшысь, Аня, найменшы Томусь.

— А і мы задаволеныя, ой, як задаволеныя! — цешыцца маці. — Яны ўсе так нас, старых, глядзяць! Вось вяселле нядаўна згулялі, і праўнучак другі нядаўна нарадзіўся. Якась Бог дае добра.

Адгаданка



1. урачысты верш прысвечаны важнай падзеі або герою, 2. горнапрамысловае прадпрыемства для здабычы руды, 3. з Будапештам, 4. службовая асоба, якая ведае важным паляваннем, 5. генератар *імпульсаў* пастаяннага току пры дапамозе якога стымулюецца скарачэнні сардэчнай мышцы, 6. імя Гартнага — Зміцера Жылуновіча, 7. спецыяліст па падводных работах, 8. месяц Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 42 нумара

Алень, Крычаў, Мележ, міліцыя, паніч, Прышвін, Сона, шоры.

Рашэнне: **Свінні можаш прычапіць крылы, але не ўчыніш яе арлом.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 730 egz.

Суседскія былі

ВЫБАР ЖАНАТАГА АЎТААМАТАРА

Віктар САЗОНАЎ



Яна для Анатоля Кавалёва была прыгажэйшай за ўсё на свеце. Харашэйшай чым белы свет, мілейшай чым жыццё, чароўнейшай чым гарэлка і прывабнейшай чым жанчына. Гэта была яго мара, яго спрадвечнае жаданне, яго начныя мроі, штодзённая праца і надзея на змены ў шэрым без прыгод і радасцей жыцці. Гэта была яго новенькая машына колеру зялёнага металіку з надпісам „Ford" на капоце і багажніку. Анатоль цяжка працаваў, каб назбіраць на яе неабходную колькасць купюр з партрэтамі амерыканскіх прэзідэнтаў. Не спаў начамі, часамі краў на заводзе розныя жалязякі, каб пасля прадаць іх у Польшчы, падбіраў усё што кепска ляжыць, прымаў падарункі ад цешчы і бацькоў у выглядзе банкнотаў нацыянальных банкаў розных краін свету, капаўся на лецішчы, эканоміў на ежы і адзенні, але нарэшце здолеў рэалізаваць жаданне старога аўтамабіліста, якому, па вушы спэцканаму ў маторным алеі, прыходзілася апошнія дваццаць гадоў больш капацца ў рухавіку старэнькага і наскрозь прагніўшага „Масквіча", чым сядзець за яго рулём.

Набыў бы Кавалёў аўтамабіль нашмат хутчэй, каб не каханая жонка, якая паходзіла з такой вясковай беларускай сям'і, якая лічыла, што маёмасць гэта толькі тое, што ў наяўных паперках ляжыць у хаце зашытае ў падушку, на якой ніхто не спіць. Таму носьбіту аўтамары прыходзілася выварочвацца як вужу прабітаму віламі, каб схаваць ад каханай свае рэальныя прыбыткі і дзень за днём, месяц за месяцам, гадочак за гадочкам, прытрымліваючыся ўсіх мераў таямнічасці, употай адкладваць капеечку да капеечкі, грошык да грошыка, цэнцік да цэнціка і нарэшце набраць такую кучку грошыкаў, каб ключы ад аўтамабіля „Форд" прыемна прытуліліся да яго правай далоні.

— Грошы з сям'і краў, — наракала жонка, убачыўшы новенькі самаход. — З горла ў дзяцей вырываў, абы толькі свой азадак мякчэй прыстоіць. Ну нічога. Цяпер я ўсе твае прыбыткі і страты буду кантраляваць асабіста. Цяпер ты не сапрэш ані кроплі.

І прыляпілася да мужа так, як у лазні бярозавы ліст ад веніка прыліпае да задніцы. Ды ні на крок не адыходзіць, нібы той уцякаць збіраўся. Найперш нарабіла ляманту ў страхавой кампаніі. Анатоль хацеў купіць для такой прыгожай і дарагой машыны добрую страхоўку. На ўсе выпадкі жыцця, як гаворыцца. Але родненькая жонка запярэчыла.

— Што, — кажа, — думаеш і далей грошы размотваць. Смяцiць грашамі і зараз збіраешся? Не атрымаецца. Страхоўку купляй самую танную.

— Але ж яна не ў кожным выпадку дапамагае, — пачаў адстойваць сваё збянтэжаны Кавалёў. — Прыкладам, калі я буду вінен у аўтадарожным здарэнні, то маю машыну ніхто рамантаваць не будзе. Так больш згублю.

— Не ўмееш ездзіць, сядзі ў хаце, — не супакойваецца кабета. — Я сама за руль сяду. Здарэнні ён надумаўся рабіць, брыда. Забіваць такіх трэба.

І села. За руль. Ды толькі выехала на дарогу, ды як лясне ў нейкую „Мазду". Прыйшлося за свае грошы „Форда" аднаўляць. Але жанчына сваёй віны не прызнае, хоць ты кол на яе галаве чашы. Стаіць на сваім, як псіх ля шчытка з надпісам „Ток. Заб'е", і нічога думаць не хоча. Пляце нейкую лухту, як маку пераеўшы.

— Гэта ўсё таму здарылася, што ты нячэсна грошы адкладаў. Ад сям'і хаваўся. Вось Бог цябе і пакараў. Трэба схадзіць да шаптухі, хай яна замовіць, і машына ніколі ў аварыю не патрапіць. І ніякія страхоўкі непатрэбныя.

— Не, не і не, — вырашыў выказаць свае меркаванні муж. — Мы плацілі таму, што ты грошай на добрую страхоўку пашкадавала. І я думаю, што цяпер лепш у царкву пад'ехаць. Хай лепей поп асвяціць машыну, чым шаптуха будзе над ёй нешта барматаць.

— Ні ў якім разе, — не пагаджаецца жонка. — Ведаеш колькі поп грошай здзярэ? Лепш ужо страхоўку купляць, чым туды сунуцца. Едзем да шаптухі.

Шаптуха пашаптала. Кажа, цяпер усё будзе добра. Толікава жонка расплацілася з ёй самай малой купюрай, якую толькі мела. Ды не паспелі ад'ехацца адтуль і некалькі метраў, як машына правалілася ў глыбокую яму на дарозе ды выламала кола.

— Ну што! — зароў Анатоль такім голасам, нібыта ў яго гарляк уставілі дынамікі новай мадэлі, разлічаныя выключна для аматараў музыкі ў стылі хэві-метал. — Пашкадавала шаптусе даць болей. Вось цяпер і маеш. З тымі шаптухамі трэба асцярожна. А я, на яе месцы, за такую аплату як ты дала, увогуле наваражыў бы, каб машына ўзарвалася разам з табой.

— Добра, — агрызаецца жонка, — не лямантуй. Паехалі да папа. Толькі плаціць буду я.

— Глядзі, толькі не жміся, — папярэдзіў яе Анатоль, — бо скупы плаціць двойчы.

Машына заехала ў адчыненую царкоўную браму. Святар асвяціў яе, папырскаў святой вадой, памаліўся.

— Колькі з нас? — пытае кабета.

— Колькі заахвяруеце, столькі і хопіць, — адказвае бацюшка.

Ну то жанчына і яму ўсунула найменшую купюру якую мела, ускочыла ў машыну ды камандуе, закрываючы дзверы ўжо пры яздзе:

— Хутчэй паехалі, пакуль не сказаў даць болей!

І тут нечакана рвануў моцны вецер. Цяжкая металічная царкоўная брама не вытрымала яго напору і зачыняючы ўезд у царкоўны двор памагла спадарыні Кавалёвай зачыніць дзверы ў яе машыне.

Машынныя дзверы выгнуліся пад такім прамым вуглом, што мала якія вымяральныя прыборы могуць з такой дакладнасцю паказаць вугал у 90 градусаў.

— Стой, — заныла жанчына. — Трэба нешта рабіць!

— Трэба рваць, дзерці адсюль як мага хутчэй, — адказвае муж. — Ты крыж на грудзях у бацюшкі бачыла? Вялікі такі, цяжкі. Ён зараз за такую аплату тым крыжам яшчэ ўсе вокны ў машыне павыбівае. Паехалі на аўтарынак. Прадам я гэты самаход ды буду далей на „Масквічы" ездзіць адзін, бо з табой ад гэтай машыны хутка толькі куча металу застанецца. Ды такога, які і на металалом не возьмуць. А можа паехаць у загс ды развесціся з табой. Тады „Форда" можна будзе пакінуць. Паглядзім. Падумаю пра гэта па дарозе, бо сапраўды не ведаю што лепш. Застацца з табой і сваёй марай пра добрую машыну, ці без цябе, але хоць з адной рэалізаванай у жыцці марай.

25.11 – 01.12

Баран (22.03. — 20.04.) Варта падацца ў падарожжа — вельмі добра адпачнеш. Вельмі добрыя рэляцыі са знаёмымі, забудзешся пра ўсе правіны. На працы і ў школе пільнуй перш за ўсё пунктуальнасці.

Бык (21.04. — 21.05.) Да 28.11. здзейсняцца ўсе твае сны аб каханні. Паправа адносін з шэфам. Падумай, ці не спалучыць хобі з працай. Калі былі непаладкі на працы, кіраўніцтву стане ясным, што ты тут ні пры чым.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Пераканаешся, што ў маны кароткія ногі. Сябры могуць страціць да цябе давер і не зможаш разлічваць на іх падтрымку ці ветлівасць. Партнёр незадаволены, што службовыя справы для цябе важнейшыя. Затое можаш спраўна скінуць пару кілагарамаў.

Рак (23.06. — 23.07.) 24.11. папсуецца табе настрой, ды на коратка. Пакажаш цяпер усім, дзе зімуюць ракі! Акажашся быць сапраўдным стражнікам сямейнага шчасця. Гарачыя рандэву (вядома, у свабодных Ракаў). Да 26.11. не ангажуйся ў некарысныя інтарэсы. На недахоп працы наракаць не будзеш. Не еш тлустых страў.

Леў (24.07. — 23.08.) Калі будзеш самотны, дык па сваім жаданні. Не будзь горкі і несамаўпэўнены, бо напалохаеш аматараў. А харошы час на каханне! Зрабі імпрэзу (арганізаваную ў складчыну) у сябе дома. Пазбягай старых ворагаў. Не назапашвай стрэсу і злосці ў сабе, каб не адбілася гэта на здароўі.

Дзева (24.08. — 23.09.) Могуць ахаладзіцца кантакты з сям'ёй, з суседзямі можа табе быць таксама не па дарозе. Адкрыеце ў пары ўласныя небанальныя сцежкі. Праводзь актыўна час з сябрамі, ды добра высыпайся.

Шалі (24.09. — 23.10.) 25.11. нічога не перавялічвай і не злуйся. Будзеш схільны да радыкальных вырашэнняў, а яны не мусяць быць для цябе добрыя. У пары будзеце спакойнымі, поўнымі надзеі на будучыню. Пазнаёмішся з сімпатычнымі людзьмі, якія дададуць табе моцы, унутранай раўнавагі.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Твая бескампраміснасць можа быць не толькі тваёй сілай, але і слабасцю. Не трактуй жыцця ў пары як спаборніцтва. Многа нагод самотнаму Скарпіёну для рамантычных сустрэч. Адзін з сяброў наваліць на цябе столькі сваіх спраў, што забудзешся пра свае. Знакаміта ў фінансах.

Стралец (23.11. — 22.12.) Паявіцца многа шматабяцальных сітуацый, дзякуючы якім дасягнеш сваіх мэт. Новыя магчымасці; поўнасцю выкарыстай свой патэнцыял. Трымайся абранага шляху і не ідзі напрасткі. Можаш на хвілю страціць пачуццё бяспекі.

Казярог (23.12. — 20.01.) Горшы настрой, недахоп шчасця, непатрэбныя згрызоты. Калі ты ў чымсьці няўпэўнены, не пераконвай сябе сілай да некаторых спраў. Не прымушай сябе да нічога, бо не дасягнеш мэты, а адно расчаруешся.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Напачатку адчуеш прыліў ажыўляючай энергіі, у фінансах паявяцца новыя шанцы. Ды пасля ахопіць цябе пануры настрой, будзеш раздражнены. Асабліва на працы будзь вельмі асцярожны. Ды ўсё, што дагэтуль не вельмі ішло, нябярэ імклівасці, а ад падзей завіруе табе ў галаве.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Нагоды для рандэву і рамантычных сустрэч. Бізнесавыя і фінансавыя справы таксама складуцца памысна. У пары не трапляй у крайнасці, цешся тым, што маеш, смакуй кожную хвіліну з каханай асобай. У хатніх справах усё перакулена дагары нагамі; варта нават кудысьці з'ехаць ці перасяліцца.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Гайнаўка — Камянец - III

Ніва
ПРА КУЛЬТУРУ

„Паазер'е" ў Беластоку - IV

Родам з Беласточчыны

Уладыслаў Чаржынскі — крытык і літаратуразнавец

Сяргей ЧЫГРЫН

У мінулым годзе ў „Ніве" (№ 20 ад 14 траўня) быў апублікаваны мой артыкул пра беларускага літаратуразнаўца, крытыка, лексікографа і педагога Уладыслава Чаржынскага (1897-1974), які нарадзіўся ў Сакольскім павеце. Сёння хацелася б расказаць пра яго, як пра беларускага крытыка і літаратуразнаўца, тым больш, што за апошні час знайшоў я шмат новых цікавых звестак пра гэтага таленавітага чалавека. Ды і сёлета 15 траўня яму споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння (у біябібліяграфічным слоўніку „Беларускія пісьменнікі" (Мінск 1993, т. 2, с. 356) дата нараджэння не ўказана, а толькі год).

Максім Гарэцкі ў сваёй „Гісторыі беларускай літаратуры" напісаў: „Літаратурная крытыка развівалася ў нас ужо ў нашаніўскую пару (М. Багдановіч, Л. Гмырак — забіты на вайне ў 1915 годзе, А. Навіна, В. Ластоўскі і інш.). Цяпер яна ўсходзіць на больш падрыхтаваны і навуковы грунт (М. Піятуховіч, У. Дзяржынскі і інш.)". У. Дзяржынскі, Улідзе — гэта псеўданімы Уладыслава Чаржынскага. Пад гэтымі псеўданімамі наш зямляк выступаў з крытычнымі артыкуламі ў розных беларускіх выданнях у 1920-х гадах.

У 1928 годзе ў Мінску асобным выданнем выйшла праца Уладыслава Чаржынскага „Да пытання аб псіхалагічным стылі нашаніўскай паэзіі". Яна спачатку была надрукавана ў сакавіцкім нумары часопіса „Узвышша" ў 1928 годзе. Перачытаў я нядаўна гэты матэрыял. Ён сапраўды заслугоўвае ўвагі, бо ў ім крытык выступіў супраць таго, што пісалі, напрыклад, Піятуховіч, Замоцін, якія адзначалі, што „скептыкам і пэсымістым выступае перад намі і Максім Багдановіч... Раней, Колас любіў сьпяваць супакой прыроды: ён любіў, падобна Цютчаву, Мэдэрлінку, прыслухоўвацца да начное цішыні, бо раненае сэрца патрабуе цішыні і спакою". Чаржынскі ім адказвае: „Наадварот, Я. Колас — пясьняр буры, навальніцы, грому, бліскавіц. Ні ў кога з беларускіх поэтаў гэтыя грозныя зьявы прыроды не знайшлі такога мастацкага выяўленьня, як іменна ў Якуба Коласа" („Узвышша", 1928, № 3, с. 128). Чаржынскі прааналізаваў некалькі вершаў Якуба Коласа і прыйшоў да высновы, што „смутная настраёвасьць коласаўскай лірыкі асабіста інтымных перажываньняў нічога супольнага ня мае з філёзофскай сыстэмай пэсымізму" (там жа, с. 138). Можа крытык і перабольшваў, калі сцвярджаў, што наша літаратура самая жыццясцвярджальная з літаратур таго часу, але, як піша Ігар Жук „унутраны аптымістычны пафас яе Чаржынскі адчуваў амаль бездакорна" (Ігар Жук, *Сустрэчны рух*, Гродна 1998, с. 44).

Уладыслаў Чаржынскі, 1930-я гады. Фота друкуецца ўпершыню

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (ф. 205, вып. 3, спр. 8909) нядаўна выявіў я заяву У. Чаржынскага, якую ён пісаў у Беларускі дзяржаўны універсітэт: „Гэтым прашу залічыць мяне сталым слухачом на этналагічна-лінгвістычны аддзел факультэту грамадзянскіх навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта па цыклу беларускае мовы. Скончыў у 1918 годзе 7 класаў мужчынскай гімназіі Фальковіча й Зубакіна ў Менску. У 1918-1919 гадах працаваў як настаўнік у вячэрняй школе для дарослых, якая была арганізавана мною ж у м. Пасадцы Вілейскага павета. Адначасна з гэтым даваў прыватныя лекцыі ў розных класах сярэдняй школы. У 1920 годзе з прыходам на Беларусь савецкае ўлады зрабіўся сталым супрацоўнікам штодзённае газеты „Савецкая Беларусь", у якой працую й да апошняга часу...". Сапраўды, працуючы ў „Савецкай Беларусі" Уладыслаў Чаржынскі публікуе тут свае артыкулы на розныя тэмы. Да 5-годдзя часопіса „Полымя" з'яўляецца матэрыял „Літаратурная трыбуна" („Савецкая Беларусь", 1926, 25 снежня). У нумары „СБ" ад 16 траўня 1925 года крытык разважае аб праблемах беларускае мастацкае культуры ў міжнародным кантэксце, аб тым, што наша тагачасная літаратура ўнясла ў скарбніцу агульнаеўрапейскай літаратуры, які сацыяльны клас пераважна знайшоў у ёй свой адбітак. На думку У. Чаржынскага, „матывы нацыянальнага і сацыяльнага змаганьня ў сваім найдасканальшым сінтэзе разгарнуты ў беларускай літаратуры з такой глыбінёй і мастацкай эмоцыянальнасьцю, што яны чырвонагністымі бляскамі мігацяць на агульна літаратурным эўрапэйскім фоне". І вялікая заслуга ў гэтым, сцвярджае крытык, і з ім нельга не пагадзіцца, Янкі Купалы. „Янка Купала — выдатнейшы корыфэй беларускае літаратуры, які так нядаўна яшчэ быў як бы ўвасабленьнем усёй нашай паэзіі, — зьяўляецца адначасна піанэрам найноўшага беларускага пісьменства", — пісаў наш зямляк. „Калі Гомэр, Дантэ, Шэкспір, Байрон, Гэтэ, Міцкевіч, Пушкін і іншыя, — сцвярджае Уладыслаў Чаржынскі, — выяўлялі ў сваіх творах пераважна волю да жыцьця чалавека наогул, то Янка Купала з найвялікшым мастацтвам праяўляе ня толькі ў сваёй творчасьці, але самой сваёй постацьцю песняра-мужыка волю да жыцьця працоўнага эксплёатаванага селяніна, беларускага селяніна. У гэтым іменна розьніца, у гэтым самабытнасьць, у гэтым і веліч Янкі Купалы, а побач зь ім і беларускае поэзіі, у параўнаньні з паэзіяй і паэтамі агульнаэўрапэйскай культуры".

Акрамя „Савецкай Беларусі" наш літаратуразнавец і крытык шмат друкуецца ў часопісах „Полымя", „Узвышша", „Асьвета". У 1925 годзе ў Мінску выйшаў з друку зборнік паэзіі Янкі Купалы „Безназоўнае". У „Полымі" адразу друкуецца невялікая нататка пра гэты зборнік Чаржынскага, падпісаная псеўданімам Улідзе. Крытык піша: „Цэнтральным месцам зборніку зьяўляецца поэма „Безназоўнае". Гэтая поэма заслугоўвае асаблівае ўвагі ня толькі з боку мастацкага, але і з боку ідэолёгічнага. У ёй Купала дае рэльефны зарыс нашай рэвалюцыйнай эпохі, адцяняючы яе на фоне таго недалёкага мінулага, якое перажывала працоўная Беларусь... Апрача поэмы ў зборніку бачым вязанку вершаў, напісаных у вапошнія гады. Усе гэтыя вершы як сваёй ідэолёгіяй, так і новымі мастацкімі хварбамі і настроямі падобны на „Безназоўнае" і зьяўляюцца як бы прэлюдыяй да поэмы" („Полымя", 1925, № 2, с. 200-201).

У першых нумарах часопіса „Полымя" за 1925 года Уладыслаў Чаржынскі друкуе вялікі свой артыкул нарысаў і нататак „Беларуская літаратурная сучаснасць". Рэдакцыя часопіса нават зрабіла зноску, што з некаторымі вынікамі і думкамі аўтара не пагаджаецца. Тым не менш, артыкул быў апублікаваны. У ім наш зямляк таксама звяртаецца да творчасці Янкі Купалы. У сваёй працы крытык пытаецца: чаму на працягу 1920-21 гадоў маўчыць Купала? Што такое сталася з песняром? І адразу дае адказ, што ў снежні 1921 года на старонках „Вольнага Сьцягу" з'яўляецца Купала „Песьняй аб паходзе Ігара". „Песьня," — піша Чаржынскі, — гэта закончаная музыкальная сымфонія кожная частка якой пяе дзіўную мэлёдыю, кожная струна якой гучыць самабытнымі тонамі, а ўсё разам зьліваецца ў нязвычайнай чароўнай гармоніі. З гэтага боку „Песьня" зьяўляецца запраўдным шэдэўрам беларускае найноўшае поэзіі" („Полымя", 1925, № 1, с. 148). Далей крытык разглядае зборнік вершаў Янкі Купалы „Спадчына", куды ўвайшлі вершы песняра напісаныя ім у 1906-1918 гадах, а таксама драму „Тутэйшыя", напісаную ў 1922 годзе, апублікаваную — у 1924 годзе, якая па зместу адносіцца да 1918-1920 гадоў. Пра „Тутэйшых" Чаржынскі кажа, што „п'еса можа не спадабацца як прыхільнікам ортодоксальнага рэалізму (натуралізму), так

працяг ☞ IV

І ☞працяг

Уладыслаў Чаржынскі — крытык і літаратуразнавец

і прыхільнікам літаратурнага модэрну. Рэалістыя будуць нездаволены тым, што ў п'есе ня ўсё жыве, што ў п'есе больш рэзонэрства, чымся жывой дзеі, што ў п'есе залішне карыкатуры, што ў п'есе залішне штучнага. З другога боку можа быць той закід, што п'еса замала эмоцыянальна, што п'еса ўбога глыбокімі колізіямі, што п'еса пабудавана на павярхоўных водрухах людзкіх пачуцьцяў, урэшце, што п'еса замала сцэнічна. Але ўсе гэтыя заганы будуць заганамі чыста ўмоўнымі, залежна ад таго пункту погляду, з якога падходзяць да гэтае п'есы. Нам здаецца, што ў п'есе трэба шукаць іншага…" (там жа, с. 151-152). Уладыслаў Чаржынскі добра ведаў, што трэба шукаць у п'есе, каму яна прысвечана, пра каго яна і для каго…

Абагульняючы творчасць Янкі Купалы ў 1920-я гады наш зямляк прыйшоў да высновы, што:

«1. Ліра песьняра не маўчыць, а адгукаецца на найважнейшыя падзеі гэтае сучаснасьці; а калі адгукаецца яна ня так часта, як гэтага нам хацелася б, то ў гэтым пункце мы павінны памятаць, што маем дачыненьне з мастацтвам, г.зн. такой катэгорыяй, якая не падлягае матэматычным вымерам і якая пакуль што ня жыве паводле календара, хоць бы нават савецкага.

2. Літаратурныя выступленьні песьняра ня былі дысонансам эпосе, а наадварот, як нельга лепш гармонізавалі з гэтай эпохай.

3. Перастроеная на сучасны лад („Безназоўнае") ліра песьняра ня ўтраціла сваёй ранейшай моцы, а гучыць так жа пераможна, як і раней, і мае нават тэндэнцыю заглушыць хоры новага літаратурнага рэчышча.

4. Поэта застаўся верным сабе і пры новых акалічнасьцях, грунтуючыся ў сваёй творчасьці на об'ектыўнай рэальнасьці і выступаючы, як раней, пад літаратурным знакам мастацкага рэалізму (павевы нэоклясыцызму ў „Тутэйшых" не запярэчваюць гэтага, бо нэоклясыцызм бліжэй да рэалізму, чымся да романтыкі). Усё гэта сьведчыць аб тым, што Я. Купала і ў пасьлякастрычнікавай сучаснасьці (асабліва пачынаючы з 1924 г.) становіцца вельмі значным фактарам прогрэсу ў беларускім літаратурным мастацтве» (там жа, с. 153).

Уладыслаў Чаржынскі шмат пісаў і пра Якуба Коласа. „Новую зямлю", „Сымона-музыку" і „У палескай глушы" ён назваў манументальнымі творамі беларускай літаратуры. Крытык паказаў тое адметнае, новае, што з'явілася найперш у Коласа-празаіка. А гэта дасканаласць і віртуознасць партрэтнага жывапісу, разумеючы апошняе даволі шырока — не толькі як апісанне знешняга партрэта, але і як выяўленне характару. Мае рацыю Міхась Мушынскі, які адзначае, што Чаржынскі „параўноўвае аповесць з партрэтнай галерэяй, праз якую праводзіць аўтар «зачараванага і захопленага чытача», раскрываючы яму багацце і разнастайнасць чалавечых тыпаў-характараў" (Міхась Мушынскі, *Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20-30-я гады)*, Мінск 1975, с. 166).

Пра Якуба Коласа Уладыслаў Чаржынскі напісаў вялікі крытычна-біяграфічны нарыс, які быў змешчаны ў першым томе збору твораў Якуба Коласа, што пабачыў свет у Мінску ў 1928 годзе. „Сымон-музыка" — гэта ня толькі пышны цьвет поэтыцкае індывідуальнасьці: гэта пышны цьвет беларускае поэзіі, як мастацтва", — сцвярджае наш крытык.

Вельмі моцна Уладыслаў Чаржынскі абараняе Якуба Коласа, Змітрака Бядулю і Янку Купалу, аналізуючы працу „Белорусы" Яфіма Карскага ў „Полымі" за 1923 год. Ён аб'ектыўна ўказвае на сур'ёзныя недакладнасці Карскага, які ў трэцім томе стараецца паказаць гісторыю беларускай літаратуры, пачынаючы з XIX стагоддзя, а таксама апісаў беларускі культурна-нацыянальны рух. „Незразумелым для нас зьяўляецца той мэтад, паводле якога аўтар разьмясьціў у гэтым разьдзеле пісьменнікаў, — піша Уладыслаў Чаржынскі. — Калі аўтар трымаўся мэтаду літаратурнай магутнасьці, то чаму паставіў Цётку раней Я. Купалы, Альбэрта Паўловіча, Г. Леўчыка, К. Буйло раней Бядулі-Ясакара, які бязумоўна па літаратурнай вартасьці, і па колькасьці ім напісанага стаіць бязьмерна вышэй за іх? Калі ж аўтар трымаўся хронолёгічнага прынцыпу, то чаму Альбэрт Паўловіч, Ядвігін Ш. апынуліся пасьля М. Багдановіча, К. Буйло і г.д.? А калі аўтар разьмяшчаў пісьменнікаў паводле арганічнай сувязі і сваенства матываў, стылю, крыніц творчасьці і г.д., то чаму за М. Багдановічам пастаўлен А. Паўловіч, З. Жылуновіч, Ядвігін Ш., а не Бядуля-Ясакар, які, бязумоўна, як стылем, так і матывам і бліжэй да М. Багдановіча, чымся яны" („Полымя", 1923, № 2, с. 113-114).

„Плавнику принадлежитъ и несколько прозаических статей", — піша Я. Карскі ў „Белорусах". Чаржынскі рэагуе на гэта імгненна: „Гэтак адзываецца акадэмік Е. Ф. Карскі аб пісьменьніку, якога вядома нам у друку да 80 апавяданьняў, агульным аб'ёмам каля 40-50 друкаваных аркушаў. І гэта некалькі „прозаических статей". Нечага сказаць, добрая рэгістрацыя паэтычных матэрыялаў"… (там жа, с. 123). І такіх заўваг крытык прыводзіць вельмі шмат. Таму ён, прачытаўшы трэці том „Белорусов", заявіў, што кніга Карскага „дзякуючы сваёй павярхоўнасьці вельмі мала дасьць новага для тых, хто большменш знаёмы з гісторыяй беларускае літаратуры і з гісторыяй беларускага нацыянальна-адраджэнцкага руху" (там жа, с. 132).

У вераснёўскім нумары часопіса „Полымя" за 1928 год Уладыслаў Чаржынскі апублікаваў артыкул „Дзейнасць З. Жылуновіча ў абсягу беларускай літаратурнай крытыкі". Артыкул быў вельмі актуальны на той час і сёння ён не страціў сваёй гістарычна-літаратурнай фактуры. Як мы ведаем, сам Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч) пісаў вельмі шмат: апавяданні, вершы, раман, літаратурныя агляды, крытычныя манаграфіі, крытычна-палемічныя артыкулы, рэцэнзіі і г.д. Менавіта на характарыстыцы некаторых жанраў крытыкі Цішкі Гартнага спыніўся У. Чаржынскі. Ён не толькі зрабіў вычарпальны агляд дзейнасці З. Жылуновіча ў кантэксце беларускай літаратурнай крытыкі, але паспрабаваў класіфіцыраваць яго крытычныя працы як з боку ідэалагічна-метадалагічных прынцыпаў, так і з боку літаратурнай формы і стылю. Падобная праца ў беларускай літаратуры тады была новай і даволі нялёгкай. І яе наўрад ці хто змог бы адужаць. Хіба што толькі Чаржынскі.

Група прафесараў і студэнтаў Белдзяржуніверсітэта,1924 год. Сядзіць крайні справа У. Чаржынскі



У Беларускі Дзяржаўны Універсітэт.

Заява.

Заява У. Чаржынскага, якая была напісана ім 24 жніўня 1921 года ў Белдзяржуніверсітэт

Часопіс „Узвышша" ў травеньскім нумары за 1929 год публікуе вялікі матэрыял нашага земляка, які называецца «„Нарысы гісторыі беларускае літаратуры" проф. М. М. Піятуховіча». Сапраўды, прафесар Міхайла Піятуховіч (1891-1937) у 1928 годзе выдаў першую частку сваіх „Нарысаў…". Іх уважліва прачытаў Уладыслаў Чаржынскі і на старонках папулярнага тады часопіса выказаў свае думкі і заўвагі. І яны даволі слушныя. Напрыклад, У. Чаржынскі піша: „Вось якую характарыстыку дае, напрыклад, проф. Піотуховіч В. Д. Марцінкевічу на балоне 73-й „Нарысаў": „Узятая ў цэлым творчасьць Дуніна-Марцінкевіча ўяўляе сабой яскравы продукт патрыярхальна-дваровай культуры, амаль зусім не зачэпленай уплывамі капіталізму. Гэта формула, супярэчачы гістарычнай рэчаіснасьці, ня можа даць адказу на асноўныя пытаньні, што ўзьнікаюць навокал творчасьці названага пісьменніка. Чым, напрыклад, вытлумачыць тую зьяву, што ўся творчасьць Д. Марцінкевіча зьяўляецца як бы псыхо-ідэолёгічным клеем, якім пісьменнік тужыцца склеіць сялянства і шляхту, як не распадам прыгоннае гаспадаркі? Чым вытлумачыць гэтае заахвочваньне селяніна да шчырае працы, якое мы бачым бадай у кожным творы Марцінкевіча, як ня простым рэзультатам невыстарчальнай прадукцыйнасьці сялянскае працы ў пэрыод менавіта распаду прыгоннае гаспадаркі?" і г.д. і г.д. У гэтым артыкуле Чаржынскі зрабіў некалькі заўваг і наконт трактоўкі ў „Нарысах" М. Піятуховічам паэзіі Францішка Багушэвіча і творчасці некаторых іншых класікаў беларускай літаратуры.

Вельмі добра крытык У. Чаржынскі пісаў пра беларускага гісторыка Уладзіміра Пічэту. Напрыклад, у аглядзе часопіса „Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ" (1923, кастрычнік-лістапад) у лютаўскім нумары часопіса „Полымя" за 1923 год ён піша: „Як мы бачым, гісторыка-беларуская навука мае ў асобе У. Пічэты вельмі здольнага і, адначасна з гэтым, вельмі шчырага прыхільніка".

Вельмі цёпла наш зямляк у сваіх літаратурных творах адгукаўся пра Украіну і творчасць яе пісьменнікаў. У 1924 годзе выйшаў з друку зборнік вершаў „Вітер з Украіны" Паўло Тычыны. Пад псеўданімам Улідзе „Полымя" друкуе рэцэнзію У. Чаржынскага на гэты зборнік. Яна пачынаецца так: „Вецер з Украіны, Украіны так блізкай нам, беларусам, на жаль так рэдка далятае да нас, так рэдка кудзёрыць верхавіны беларускага бору! А шкада! Гэтулькі ў гэтым ветры нам роднага, прачулага, а разам з тым, гэтулькі ў ім моцы й чараў, самабытнасьці й крыштальнай прамяністасьці. Вязанка вершаў П. Тычыны «Вітер з Украіні» можа найвыпукней увасабляе сабою гэты ўкраінскі вецер…" („Полымя", 1925, № 1, с. 179-180). Далей наш крытык не шкадуе шчырых братэрскіх слоў і пачуццяў, ён проста ў захапленні ад творчасці паэта, калі піша, што „П. Тычына — адзін з найвялікшых сучасных украінскіх паэтаў…", што „музыкі ў паэзіі П. Тычыны — як сонца ў роснай зелені летнім ранкам", што „лірыка П. Тычыны — наскрозь шчыра-пачуцьцёва"… і г.д.

Гэта мая толькі невялікая вандроўка па старонках твораў Чаржынскага-крытыка. Пасля яе я ўпэўніўся, што беларусы ў 1930 годзе (ён быў арыштаваны ДПУ БССР і высланы ў Казань) страцілі вельмі таленавітага, разважлівага і аб'ектыўнага крытыка. На вялікі жаль, сёння ў беларускай літаратуры крытыка маштабу Чаржынскага я нават і не магу назваць. Таму павучыцца пісаць і аналізаваць творы нам сёння ёсць у каго. Толькі гэтыя крытычныя артыкулы і даследаванні нашага земляка раскіданы па выданнях 1920-1930-х гадоў. Ці не пара ўжо іх сабраць пад адну вокладку і выдаць?..

Сяргей ЧЫГРЫН

Гайнаўка — Камянец

Аляксей МАРОЗ

Ужо ад нейкага часу ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы сталі калекцыянаваць даўнія фатаграфіі горада і яго жыхароў, але ў час рэалізацыі праекта „З гісторыяй у будучыню — замацаванне і папулярызацыя культурнай спадчыны рэгіёна Белавежскай пушчы" адбылася акцыя збірання здымкаў, на падставе якіх можна пазнаёміцца з гісторыяй Гайнаўкі. З ліку трох тысяч фатаграфій, звыш трыста будзе надрукаваных у кніжцы „Гайнаўка ў старой фатаграфіі". Самыя цікавыя здымкі паказваюцца на выстаўцы ў гарадской бібліятэцы. У рамках праекта працаўнікі Камянецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі збіралі фатаграфіі, звязаныя з гісторыяй і сучасным жыццём Камянца. Бібліятэкары з Беларусі маюць намер працягваць распачатую работу, а гайнаўскія бібліятэкары заклікаюць жыхароў Гайнаўскага павета прыносіць даўнія здымкі, каб у будучыні саставіць супольную калекцыю з Гайнаўшчыны.

— У мінулым наладзілі мы сустрэчу з Яўгенам Тыркелем, былым вучнем Дзяржаўнай школы дрэваапрацоўчай прамысловасці ў Гайнаўцы, які на спатканне прывёз цікавыя фатаграфіі даўняй Гайнаўкі. Тады практычна ўзнікла ідэя збіраць старыя фатаграфіі, якія ўжо паказваліся на некалькіх выстаўках, — тлумачыць старшыня Таварыства сяброў Гайнаўкі і заадно бібліятэкарка Ала Грыц, каардынатарка праекта, які рэалізаваўся са студзеня па лістапад; у канцы гэтага месяца прадбачваецца прамоцыя кніжкі „Гайнаўка ў старой фатаграфіі". — Збіраючы здымкі пазнаёміліся мы з цікавымі людзьмі, любіцелямі гісторыі горада, а сабраныя ў нас фатаграфіі з'яўляюцца гістарычнымі дакументамі, на падставе якіх можна даследаваць мінулае Гайнаўкі. У нашай кніжцы паказваюцца гісторыя і прыгажосць горада, яго жыццё і культура. Мы хочам павышаць гістарычную свядомасць, а пры гэтым у кантактах з камянецкімі бібліятэкарамі будаваць узаемную талерантнасць, пашану і сяброўства.

На калідоры гарадской бібліятэкі працуе выстаўка старых фатаграфій Гайнаўкі. Побач гарадской панарамы і здымкаў гайнаўскіх вуліц, можна ўбачыць там фатаграфіі славутага дрэваапрацоўчага прадпрыемства і іншых фабрык, лясных работнікаў і гайнавян у святочнай вопратцы. Звярнуў я ўвагу на шыкарны вакзал, збудаваны ў Гайнаўцы пры царскім часе. На экспазіцыі можна ўбачыць таксама здымкі шматгадовага гайнаўскага настаяцеля, мітрафорнага протаіерэя Антонія Дзевятоўскага разам са сваёй сям'ёй і два дамы, у якіх у міжваенны і ваенны час знаходзіліся праваслаўныя часоўні, дзе перад пабудовай Мікалаеўскай царквы маліліся гайнаўскія вернікі.

— На нашую сучаснасць і будучыню ўздзейнічае памяць аб гісторыі, перад усім горада і рэгіёна. Жыхары абодвух — Гайнаўскага і Камянецкага — рэгіёнаў, раздзеленых мяжой, але спалучаных культурнымі сувязямі, супольнай гісторыяй і прыродай Белавежскай пушчы, раней не мелі вялікіх магчымасцей на знаёмства і супрацоўніцтва. Нам залежыць на супрацоўніцтве для захавання культурнай спадчыны рэгіёна Белавежскай пушчы, — кажа дырэктарка гайнаўскай бібліятэкі Галіна Вайсковіч.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У калекцыі самых цікавых фатаграфій Гайнаўкі ёсць кавальскі варштат спадарства Мяжвінскіх. Удзельнікі праекта з Гайнаўкі і Камянца пабывалі ў старой гайнаўскай кузні, у якой зараз знаходзіцца Музей кавальства і слесарства

У час семінара „З гісторыяй у будучыню", які праходзіў у сакавіку гэтага года, Дарафей Фіёнік расказваў пра бежанства 1915 года, Ева Мароз-Кэчынская гаварыла пра культурную спадчыну рэгіёна Белавежскай пушчы, Тамаш Самойлік расказваў пра паляванні ў Белавежскай пушчы, а Ала Грыц прэзентавала старыя фатаграфіі.

Да ўдзелу ў рэалізацыі праекта былі запрошаны гарадскія і павятовыя ўлады, Таварыства сяброў Гайнаўкі, партнёры з Беларусі і жыхары горада, якія маглі прыносіць старыя фатаграфіі, вучні і настаўнікі гайнаўскіх школ, якія многа дапамаглі пры збіранні і апісванні здымкаў.

— Тры дні мы запрашалі жыхароў горада на спатканні ў нашу бібліятэку і паказвалі ім старыя фатагарафіі, якія ўдалося нам сабраць. Трэба было апісаць гэтыя здымкі і людзі ў гэтым крыху нам дапамаглі, — тлумачыць Ала Грыц, якая, карыстаючыся фатаграфіямі і інфармацыямі з мінулага горада, правяла пад трыццаць урокаў з гістарычным ухілам. — Мы знаёмілі школьнікаў з гісторыяй Гайнаўкі, пачынаючы з яе заснавання, а канчаючы на 1950 годзе, калі наша мясцовасць атрымала гарадскія правы.

Для працы ў карысць мясцовай гісторыі і культуры патрэбная матэрыяльная дапамога. Дырэктарка публічнай бібліятэкі Галіна Вайсковіч звяртае асаблівую ўвагу на дафінансаванне, якое бібліятэка атрымала ад гарадскіх улад Гайнаўкі, а Ала Грыц радуецца, што ў час рэалізацыі праекта можна было купіць, між іншым, камп'ютэр, сканер, прынтэр і фотаапарат.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На старых фатаграфіях на выстаўцы ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы адлюстраваны гістарычныя месцы і людзі, якія стваралі гісторыю (справа, пасярэдзіне відаць два дамы, у якіх у міжваенны і ваенны час знаходзіліся праваслаўныя часоўні, дзе перад пабудовай Мікалаеўскай царквы маліліся гайнаўскія вернікі)

— Каб можна было сабраць фатаграфіі і пасля апублікаваць іх, працаваў цэлы калектыў, але ініцыятаркай і душой праекта была яго каардынатарка Ала Грыц, — хваліць дырэктарка Галіна Вайсковіч. Покі была наладжана выстаўка даўніх фатаграфій Гайнаўкі, паказваліся выстаўкі здымкаў, якія тычыліся гайнаўскага настаяцеля і будаўніка Свята-Троіцкага сабора мітрафорнага протаіерэя Антонія Дзевятоўскага ды гісторыі спорту ў Гайнаўцы. Некаторыя сабраныя матэрыялы прэзентаваліся таксама ў Супраслі і Ломжы. У верасні семінар „Месца і значэнне публічнай бібліятэкі ў сучасным працэсе навучання і захавання культурнай спадчыны" наладжаны быў у Камянцы. Апрача дакладаў і дыскусіі, прэзентаваліся там гістарычныя і сучасныя фатаграфіі славутага горада, а ўдзельнікі сустрэчы знаёміліся з храмамі Камянецкай зямлі.

— Наша Камянецкая цэнтральная раённая бібліятэка носіць імя славутага Усевалада Ігнатоўскага, першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, які нарадзіўся ў Такарах, раздзеленых пасля вайны мяжой, — з гордасцю заяўляе ў пачатку размовы дырэктарка бібліятэкі Ніна Нікіцюк. — У рамках праекта сабралі мы цікавыя фатаграфіі гістарычнага і сучаснага Камянца. Здымкі прыносілі старэйшыя і маладыя людзі, а пры нагодзе мы многа даведаліся аб славутай гісторыі горада. Самае даўняе гістарычнае месца ў нас — Камянецкая вежа. Была яна збудаваная ў XIII стагоддзі і з таго перыяду лічыцца існаванне Камянца. Мы хочам надалей збіраць даўнія фатаграфіі, а пасля даклада Дарафея Фіёніка пра бежанства 1915 года, рашыліся мы даследваць гэты працэс на Камянецкай зямлі. Многа ж супольнага было ў мінулым і ёсць зараз у жыцці людзей на Камянецкай і Гайнаўскай землях, якіх яднае Белавежская пушча. Падобныя хаця б гутарковая мова на Гайнаўшчыне, якую мы пачулі ў „Хаце Сцяпана" ў Новым Беразове, і на Камянецкай зямлі.

8 і 9 лістапада адбыўся чарговы і завяршальны семінар „З гісторыяй у будучыню". У час спаткання падведзены былі вынікі рэалізацыі праекта, арганізавалася мультымедыйная прэзентацыя даўніх здымкаў Гайнаўкі і Камянца, былі зачытаны даклады пра задачы бібліятэк у вясковым асяроддзі на прыкладзе Гмінай публічнай бібліятэкі ў Белавежы і пра дзейнасць публічных бібліятэк у напрамку зацікаўлення гісторыяй свайго рэгіёна. У час экскурсій па горадзе ўдзельнікі семінара наведалі між іншым Гайнаўскі белліцэй, Беларускі музей і Музей кавальства і слесарства спадарства Мяжвінскіх. Менавіта даўні здымак кузні Мяжвінскіх знаходзіцца на выстаўцы ў гарадской бібліятэцы. На экскурсіі па Гайнаўцы пабывала таксама бібліятэкарка Святлана Кузміч з Высокага.

— Мы ў Гайнаўцы ўбачылі больш беларускага жыцця, чым можна спаткаць у Высокім, дзе беларускасць толькі адраджаецца, — кажа пасля экскурсій кіраўнік філіяла Гарадской бібліятэкі ў Высокім Святлана Кузміч. — Мы не займаемся збіраннем даўніх фатаграфій, але камплектуем артыкулы з газет і часопісаў, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб нашым даўнім горадзе, аб якім успамінаецца ўжо ў канцы XV стагоддзя. Аднак можа пачнем збіраць і фатаграфіі.

Прадбачваецца, што ў канцы лістапада адбудзецца прэзентацыя кніжкі „Гайнаўка на старой фатаграфіі" з укладышам „Камянец — прыязны горад".

— Мы рашыліся працягваць збіранне старых фатаграфій у Гарадской бібліятэцы ў Гайнаўцы і просім прыносіць да нас старыя здымкі з цэлага Гайнаўскага павета, — заклікае гайнаўская бібліятэкарка і старшыня Таварыства сяброў Гайнаўкі Ала Грыц.

Слаўнае „Паазер'е" ў Беластоку

Віктар БУРА

Мы з жонкай пакарысталіся запрашэннем Пасольства РБ прыняць удзел у другім Вечары беларускай культуры, які адбыўся 12 кастрычніка 2007 года ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку. У гэтай жа зале выступіў заслужаны народны фальклорны ансамбль „Паазер'е" з горада Паставы. Іх выступленне напоўніла маю душу незвычайным пачуццём радасці і гонару за нашых таленавітых артыстаў. Я зацікавіўся гэтым калектывам, правёў размовы з членамі ансамбля. А вось што я даведаўся аб гэтым цудоўным калектыве, яго людзях і гісторыі.

Фота Міры ЛУКШЫ

З даўніх часоў Пастаўшчына вядомая сваімі музычнымі, інструментальнымі і вакальнымі традыцыямі. Асабліва адметны след пакінулі музыкі з вёсак Груздава і Пожарцы. Сёння цяжка сказаць, калі пайшла слава пра тых музыкаў. Ад дзеда да ўнука, ад бацькі да сына, з пакалення ў пакаленне перадавалася гэтая спадчына. Па ўспамінах старажылаў, любоў да цымбалаў на Груздаўшчыне пайшла ад самабытнага цымбаліста Лявона Мельца. Ніхто не ведаў столькі старадаўніх мелодый як ён. Без яго цымбалаў не абыходзіліся на той час ні адно вяселле ці вечарына. Тут былі і цудоўныя скрыпачы Іосіф Мацкевіч, Міхаіл Давідовіч, гарманісты Браніслаў Качарга, Іван Крывенькі.

Затойваючы дыханне, слухала і назірала за імі моладзь: Пётр Рагіня, Іван Мацкевіч, Станіслаў Мелец, браты Нестар і Віктар Падгайскія, Аляксандр Кавалеўскі, Уладзімір Новік, Уладзімір Крывенькі. Напрыканцы 1930-х гадоў менавіта гэтая моладзь стварыла ў Груздаве самабытны ансамбль, які праіснаваў больш за 60 гадоў. Музыканты самі змайстравалі інструменты: цымбалы, скрыпкі і бубны. З гэтага ансамбля выраслі Груздаўскі народны цымбальны аркестр, музычныя сямейныя дынастыі Мацкевічаў, Рагіняў, Новікаў, Падгайскіх. Дзякуючы ансамблю Пастаўшчына — адзінае месца ў Беларусі, дзе захаваліся дыятанічныя цымбалы, сфарміравалася груздаўская выканальніцкая школа і зберагліся мясцовыя народныя мелодыі. У вёсцы Пожарцы жыў і працаваў таленавіты майстар Іосіф Новік. Унікальныя дыятанічныя цымбалы зробеныя ім у сярэдзіне мінулага стагоддзя, гучаць на Пастаўшчыне і сёння.

З мэтай захавання выканальніцкіх традыцый, зберажэння і перадачы новаму пакаленню груздаўскай спадчыны з 1986 года ў Пастаўскай школе мастацтваў адкрыты клас дыятанічных цымбалаў. Вядзе яго Ванда Мацкевіч, дачка знакамітага груздаўскага цымбаліста Івана Мацкевіча. Навучае дзяцей яна так як калісьці вучыў яе бацька — з рук. У той жа год у школе быў створаны і дзіцячы фальклорны ансамбль. Першымі яго слухачамі, кансультантамі і дарадчыкамі былі „Груздаўскія дзяды" — так апошнім часам называлі гэтых славутых народных музыкаў. У тым жа 1986 годзе да ансамбля „Груздаўскія дзяды" далучыліся маладыя выканаўцы — выкладчыкі Пастаўскай музычнай школы: скрыпачка Наталля Белапка, цымбалістка Ванда Мацкевіч, гарманіст Анатоль Собаль, кантрабасіст Аляксандр Собаль, дударка Галіна Хвядзевіч. Такім складам груздаўскія цымбалісты выступалі ў Полацку, Віцебску, Мінску. Для маладых музыкаў гэта былі гады навучання народнай манеры ігры ў знакамітых музыкаў, збору аўтэнтычнага фальклору, творчага пошуку, назапашвання ведаў і вопыту.

На пачатку 1990-х гадоў адзін за адным пайшлі з жыцця старэйшыя груздаўскія музыкі. Традыцыі гэтага унікальнага калектыву прадоўжылі выкладчыкі Пастаўскай школы мастацтваў. І назву „Паазер'е" далі ансамблю, бо так называецца край, дзе яны жывуць. Склад ансамбля традыцыйны: чатыры дыятанічныя цымбалы, дзве скрыпкі, гармонік, кантрабас, бубен, дудачка. Аснову рэпертуару складае мясцовая інструментальная музыка, запісаная ў груздаўскіх музыкаў і музыкаў Пастаўскага раёна.

Тут гучаць заліхвацкія, жартоўныя полькі, павольныя меладычныя вальсы, мазурка, кракавяк, падыспан, фокстрот.

Творчая дзейнасць калектыву атрымала шырокае прызнанне. У 1993 годзе ансамблю „Паазер'е" прысвоена было ганаровае званне „народны", а ў 2003 годзе — „заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь". У 2004 годзе калектыў атрымаў спецыяльную прэмію прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Апрача гэтага калектыў быў лаўрэатам шматлікіх айчынных і міжнародных фестываляў, гастраліраваў у Польшчы, Малдове, Расіі, Украіне, Югаславіі, Літве, Латвіі і Эстоніі.

Новыя „Тэрмапілы"

Раіна СТЭФАНЧУК

Паказаўся новы нумар літаратурнага штогодніка „Тэрмапілы", які выдаецца ў Беластоку Беларускім літаратурным аб'яднаннем „Белавежа". Адкрывае яго „З табою, восень" — як гэта акрэсліў аўтар Янка Сіпакоў — дзённік настрою.

У дзённіку думкі аб рэчаіснасці набіраюць паэтычнага вымярэння, нават у тых момантах, у якіх аўтар піша аб іконах беларускай літаратуры, такіх як Васіль Быкаў ці Якуб Колас. Янка Сіпакоў выходзіць па-за круг беларушчыны да такіх адлеглых культур як Японія. На канец піша так: „Пяць бакоў свету. Чатыры бакі добра ведаем. Разбудзі нас уначы — скажам: усход і захад, поўнач і поўдзень. Але ж у свету ёсць яшчэ і пяты бок. Гэта — небасхіл. Бо ўсе бакі ўпісаны ў круг — гарызонт. Значыць, круг — пяты бок свету. І ты, у якім бы накірунку ні ішоў, абавязкова прыйдзеш якраз да яго".

Таксама сваімі запіскамі ў форме дзённіка дзеліцца з чытачамі Сакрат Яновіч. Яго заўвагі ахопліваюць перыяд ад мая 2005 да красавіка 2007 года. Іначай, аднак, чым у Янкі Сіпакова, гэта лапідарна зафіксаваныя факты і здарэнні, якіх пісьменнік з Крынак быў сведкам або галоўным героем. Такі самы ўзровень прыватнасці можна знайсці ў непублікаваных дагэтуль пісьмах беларускага паэта, празаіка, перакладчыка і літаратуразаўцы Уладзіміра Дубоўкі, якія напісаў Янку Саламевічу. Сярод чыста эпісталярных нататак можна тут знайсці нават народную казку „Дуб і граб". Дарэчы, як у кожным нумары „Тэрмапілаў", і ў апошнім шмат паэзіі. Самае цікавае, што ў гэты раз адносна многа — жаночай, або, каб сказаць больш трапна — напісанай жанчынамі. Публікуюць свае паэтычныя творы м.інш. Ніна Мацяш, Аксана Спрынчан, Ірына Багдановіч ці Ярына Дашына. У гэтую паэтычную частку „Тэрмапілаў" ўпісваецца новая рубрыка „Паэтычны практыкум", якая рэдактару часопіса прыйшла ў галаву ў час заняткаў са студэнтамі. Вершы тут апублікаваныя здаюцца быць своеасаблівым даследчыцкім матэрыялам. Усе пачынаюцца са слоў: *Трава пазелянела на вачах, узышло вясенняе свяціла...* Далей кожны аўтар кіруецца з дапамогай уласных слоў у напрамку ўжо толькі сваёй уражлівасці і ўявы. Праз гэты эксперымент досыць лёгка можна адрозніць індывідуальнасць аўтараў: Юстыны Грыцюк, Міры Лукшы, Жэні Мартынюк, Аліны Масайла, Віялеты Саевіч, Марты Сельвясюк і адзінага мужчыны ў гэтай гронцы Яна Чыквіна.

Фота Міры ЛУКШЫ

Маладая і прыгожая змена „белавежцаў"

Урэшце, у крытычна-літаратурнай частцы вельмі цікавы тэкст публікуе Генадзь Праневіч з Брэста аб Льве Сапегу і „эпосе нацыянальнага адраджэння Беларусі". Адзначае ён: „Для гуманістычнай Еўропы імя Льва Сапегі доўгі час аставалася сімвалам палітыкі Новага Часу, прыкладам палітыка, пераадолеўшага і адпрэчыўшага макіявелізм, чыя дзейнасць была паслядоўна скіравана на абарону нацыянальных інтарэсаў, дасягненне высокіх мэтаў гуманістычнага развіцця, сцвярджэннем ідэалаў свабоды і справядлівасці".

Чарговы раз аказалася, што „Тэрмапілы" дапаўняюць беларускамоўны літаратурны і крытычна-літаратурны рынак. Самы новы нумар тым больш асабліва важны, што паказаўся да юбілею Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа".